БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ

ЖУРНАЛ
БЕЛОРУССКОГО ГОСУДАРСТВЕННОГО УНИВЕРСИТЕТА

ИСТОРИЯ

ЧАСОПІС
БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА

ГІСТОРЫЯ

JOURNAL
OF THE BELARUSIAN STATE UNIVERSITY

HISTORY

Издается с января 1969 г.
(до 2017 г. – под названием «Веснік БДУ. Серыя 3, Гісторыя. Эканоміка. Права»)

Выходит один раз в квартал

3 **2026**

МИНСК
БГУ

РЕДАКЦИОННАЯ КОЛЛЕГИЯ

Главный редактор — **КОХАНОВСКИЙ А. Г.** – доктор исторических наук, профессор; декан исторического факультета Белорусского государственного университета, Минск, Беларусь. E-mail: kohanovsky@bsu.by

Заместитель главного редактора — **МЕНЬКОВСКИЙ В. И.** – доктор исторических наук, профессор; профессор кафедры истории России исторического факультета Белорусского государственного университета, Минск, Беларусь. E-mail: menkovski@bsu.by

Ответственный секретарь — **МАСКЕВИЧ А. И.** – кандидат исторических наук, доцент; заведующий кафедрой истории Беларуси нового и новейшего времени исторического факультета Белорусского государственного университета, Минск, Беларусь. E-mail: maskevich@bsu.by

Бон Т. Гисенский университет им. Юстуса Либиха, Гисен, Германия.
Бородкин Л. И. Московский государственный университет им. М. В. Ломоносова, Москва, Россия.
Волански Ф. Институт истории Вроцлавского университета, Вроцлав, Польша.
Жанбосинова А. С. Научно-исследовательский центр Евразийского национального университета им. Л. Н. Гумилева, Астана, Казахстан.
Жеребцов И. Л. Институт языка, литературы и истории Коми научного центра Уральского отделения Российской академии наук, Сыктывкар, Россия.
Линднер Р. Констанцкий университет, Констанц, Германия.
Минасян Э. Г. Ереванский государственный университет, Ереван, Армения.
Упадуэй А. Центр российских и центральноазиатских исследований Университета им. Джавахарлала Неру, Нью-Дели, Индия.
Фишер Д. Техасский университет в Браунсвилле, Браунсвилл, США.
Фэн Ш. Институт международных отношений и регионального развития, Центр изучения России Восточно-Китайского педагогического университета, Шанхай, Китай.
Шмигель М. Университет Матея Бела, Банска-Бистрица, Словакия.
Яновский О. А. Белорусский государственный университет, Минск, Беларусь.

МЕЖДУНАРОДНЫЙ РЕДАКЦИОННЫЙ СОВЕТ

Белоусов Л. С. Московский государственный университет им. М. В. Ломоносова, Москва, Россия.
Вабищевич А. Н. Брестский государственный университет им. А. С. Пушкина, Брест, Беларусь.
Виддер Э. Институт средневековой истории Тюбингенского университета им. Эберхарда Карла, Тюбинген, Германия.
Дук Д. В. Могилёвский государственный университет им. А. А. Кулешова, Могилёв, Беларусь.
Карпов С. П. Московский государственный университет им. М. В. Ломоносова, Москва, Россия.
Карпюк С. Г. Институт всеобщей истории Российской академии наук, Москва, Россия.
Коваленя А. А. Национальная академия наук Беларуси, Минск, Беларусь.
Космач В. А. Витебский государственный университет им. П. М. Машерова, Витебск, Беларусь.
Кошелев В. С. Белорусский государственный университет, Минск, Беларусь.
Лавринович Д. С. Могилёвский государственный университет им. А. А. Кулешова, Могилёв, Беларусь.
Ларин М. В. Историко-архивный институт Российского государственного гуманитарного университета, Москва, Россия.
Лозовюк П. Западно-Чешский университет, Пльзень, Чехия.
Локотко А. И. Национальная академия наук Беларуси, Минск, Беларусь.
Марзалюк И. А. Палата представителей Национального собрания Республики Беларусь, Минск, Беларусь.
Мезга Н. Н. Гомельский государственный университет им. Франциска Скорины, Гомель, Беларусь.
Микнис Р. Институт истории Литвы, Вильнюс, Литва.
Нечухрин А. Н. Гродненский государственный университет им. Янки Купалы, Гродно, Беларусь.
Новогродский Т. А. Белорусский государственный университет, Минск, Беларусь.
Туманс Х. Латвийский университет, Рига, Латвия.
Ураков Д. Ж. Национальный университет Узбекистана им. Мирзо Улугбека, Ташкент, Узбекистан.
Ходин С. Н. Белорусский государственный университет, Минск, Беларусь.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

Галоўны рэдактар — **КАХАНОЎСКІ А. Г.** – доктар гістарычных навук, прафесар; дэкан гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Мінск, Беларусь.
E-mail: kohanovsky@bsu.by

Намеснік галоўнага рэдактара — **МЕНЬКОЎСКІ В. І.** – доктар гістарычных навук, прафесар; прафесар кафедры гісторыі Расіі гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Мінск, Беларусь.
E-mail: menkovski@bsu.by

Адказны сакратар — **МАСКЕВІЧ Г. І.** – кандыдат гістарычных навук, дацэнт; загадчык кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Мінск, Беларусь.
E-mail: maskevich@bsu.by

Бародкін Л. І. Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя М. В. Ламаносава, Масква, Расія.
Бон Т. Гісенскі ўніверсітэт імя Юстуса Лібіха, Гісен, Германія.
Валанскі Ф. Інстытут гісторыі Вроцлаўскага ўніверсітэта, Вроцлаў, Польшча.
Жанбасінава А. С. Навукова-даследчы цэнтр Еўразійскага нацыянальнага ўніверсітэта імя Л. М. Гумілёва, Астана, Казахстан.
Жарабцоў І. Л. Інстытут мовы, літаратуры і гісторыі Комі навуковага цэнтра Уральскага аддзялення Расійскай акадэміі навук, Сыктыўкар, Расія.
Лінднер Р. Канстанцкі ўніверсітэт, Канстанц, Германія.
Мінасян Э. Г. Ерэванскі дзяржаўны ўніверсітэт, Ерэван, Арменія.
Упадуэй А. Цэнтр расійскіх і цэнтральнаазіяцкіх даследаванняў Універсітэта імя Джавахарлала Неру, Нью-Дэлі, Індыя.
Фішэр Д. Тэхаскі ўніверсітэт у Браўнсвіле, Браўнсвіл, ЗША.
Фэн Ш. Інстытут міжнародных адносін і рэгіянальнага развіцця, Цэнтр вывучэння Расіі Усходне-Кітайскага педагагічнага ўніверсітэта, Шанхай, Кітай.
Шмігель М. Універсітэт Мацея Бела, Банска-Бістрыца, Славакія.
Яноўскі А. А. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск, Беларусь.

МІЖНАРОДНЫ РЭДАКЦЫЙНЫ САВЕТ

Белавусаў Л. С. Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя М. В. Ламаносава, Масква, Расія.
Вабішчэвіч А. М. Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна, Брэст, Беларусь.
Відэр Э. Інстытут сярэднявечнай гісторыі Цюбінгенскага ўніверсітэта імя Эберхарда Карла, Цюбінген, Германія.
Дук Д. У. Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова, Магілёў, Беларусь.
Каваленя А. А. Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Мінск, Беларусь.
Карпаў С. П. Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя М. В. Ламаносава, Масква, Расія.
Карпюк С. Г. Інстытут усеагульнай гісторыі Расійскай акадэміі навук, Масква, Расія.
Космач В. А. Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава, Віцебск, Беларусь.
Кошалеў У. С. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск, Беларусь.
Лазавюк П. Заходне-Чэшскі ўніверсітэт, Пльзень, Чэхія.
Лакотка А. І. Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Мінск, Беларусь.
Ларын М. В. Гісторыка-архіўны інстытут Расійскага дзяржаўнага гуманітарнага ўніверсітэта, Масква, Расія.
Лаўрыновіч Д. С. Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова, Магілёў, Беларусь.
Марзалюк І. А. Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Мінск, Беларусь.
Мікніс Р. Інстытут гісторыі Літвы, Вільнюс, Літва.
Мязга М. М. Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны, Гомель, Беларусь.
Навагродскі Т. А. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск, Беларусь.
Нячухрын А. М. Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы, Гродна, Беларусь.
Туманс Х. Латвійскі ўніверсітэт, Рыга, Латвія.
Уракаў Д. Ж. Нацыянальны ўніверсітэт Узбекістана імя Мірзо Улугбека, Ташкент, Узбекістан.
Ходзін С. М. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск, Беларусь.

EDITORIAL BOARD

Editor-in-chief	**KAKHANOUSKI A. G.**, doctor of science (history), full professor; dean of the faculty of history, Belarusian State University, Minsk, Belarus. E-mail: kohanovsky@bsu.by
Deputy editor-in-chief	**MENKOUSKI V. I.**, doctor of science (history), full professor; professor at the department of Russian history, faculty of history, Belarusian State University, Minsk, Belarus. E-mail: menkovski@bsu.by
Executive secretary	**MASKEVICH H. I.**, PhD (history), docent; head of the department of modern and contemporary history of Belarus, faculty of history, Belarusian State University, Minsk, Belarus. E-mail: maskevich@bsu.by

Bohn T. Justus Liebig University of Giessen, Giessen, Germany.
Borodkin L. I. Lomonosov Moscow State University, Moscow, Russia.
Feng Sh. School of Advanced International and Area Studies, Centre for Russian Studies, East China Normal University, Shanghai, China.
Fisher D. University of Texas Rio Grande Valley, Brownsville, USA.
Lindner R. University of Konstanz, Konstanz, Germany.
Minasyan E. G. Yerevan State University, Yerevan, Armenia.
Šmigeľ M. Matej Bel University, Banská Bystrica, Slovakia.
Upadhyay A. Centre for Russian and Central Asian Studies, Jawaharlal Nehru University, New Delhi, India.
Wolański F. Institute of History, University of Wroclaw, Wroclaw, Poland.
Yanouski A. A. Belarusian State University, Minsk, Belarus.
Zhanbossinova A. S. Research Centre of L. N. Gumilyov, Eurasian National University, Astana, Kazakhstan.
Zherebtsov I. L. Institute of Language, Literature and History, Komi Science Centre, Ural Branch of the Russian Academy of Sciences, Syktyvkar, Russia.

INTERNATIONAL EDITORIAL COUNCIL

Belousov L. S. Lomonosov Moscow State University, Moscow, Russia.
Duk D. V. Mogilev State A. Kuleshov University, Mogilev, Belarus.
Karpov S. P. Lomonosov Moscow State University, Moscow, Russia.
Karpyuk S. G. Institute of World History, Russian Academy of Sciences, Moscow, Russia.
Khodzin S. N. Belarusian State University, Minsk, Belarus.
Koshelev V. S. Belarusian State University, Minsk, Belarus.
Kosmach V. A. Vitebsk State University named after P. M. Masherov, Vitebsk, Belarus.
Kovalenya A. A. National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus.
Larin M. V. Institute for History and Archives, Russian State University for Humanities, Moscow, Russia.
Lavrinovich D. S. Mogilev State A. Kuleshov University, Mogilev, Belarus.
Lokotko A. I. National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus.
Lozoviuk P. University of West Bohemia, Plzeň, Czehia.
Marzaluk I. A. House of Representatives of the National Assembly of the Republic of Belarus, Minsk, Belarus.
Miazga M. M. Francisk Skorina Gomel State University, Gomel, Belarus.
Miknys R. Institute of Lithuanian History, Vilnius, Lithuania.
Nechukhrin A. N. Yanka Kupala State University of Grodno, Grodno, Belarus.
Novogrodsky T. A. Belarusian State University, Minsk, Belarus.
Tumans H. University of Latvia, Riga, Latvia.
Vabishchevich A. N. Brest State A. S. Pushkin University, Brest, Belarus.
Widder E. Medieval History Institute, Eberhard Karls University of Tübingen, Tübingen, Germany.
Urakov D. Z. National University of Uzbekistan named after Mirzo Ulugbek, Tashkent, Uzbekistan.

История беларуси

Гісторыя беларусі

Belarusian history

УДК 94(476)«-40/-10»

ПРЕДВАРИТЕЛЬНЫЕ РЕЗУЛЬТАТЫ ИССЛЕДОВАНИЙ НОВОГО ПАМЯТНИКА ПАЛЕОЛИТА БЕЛЫЕ РЕЧКИ – 1 (ВОЛКОВЫССКИЙ РАЙОН, ГРОДНЕНСКАЯ ОБЛАСТЬ)

А. Д. ГОРШКОВ[1)]

[1)]*Гродненский государственный университет им. Янки Купалы, ул. Ожешко, 22, 230023, г. Гродно, Беларусь*

Аннотация. Вводятся в научный оборот результаты исследований нового памятника археологии Белые речки – 1. Объект открыт автором весной 2025 г. во время разведки около г. п. Россь, которая проводилась в целях обследования местности на наличие стоянок финального палеолита. Летом этого же года в рамках археолого-этнографической практики студентов-историков и деятельности студенческой научно-исследовательской археологической лаборатории были осуществлены раскопки и шурфовка местности. К концу полевого сезона была собрана коллекция материалов (728 предметов), которые залегали в культурном пласте и культуросодержащем горизонте. Размещение памятника в зоне распространения отложений верхнепоозерского времени позволило отнести часть предметов, залегавших в песчано-гравийных отложениях, к позднему палеолиту. Данная гипотеза подтверждается технико-морфологической характеристикой артефактов и их внешним состоянием. Кроме данных материалов, в культурном пласте зафиксированы предметы, которые относятся к финальному палеолиту, возможно, мезолиту, периоду от позднего неолита до раннего железного века, Новейшему времени. Таким образом, памятник Белые речки – 1 является первым объектом,

Образец цитирования:
Гаршкоў АД. Папярэднія вынікі даследаванняў новага помніка палеаліту Белыя рэчкі – 1 (Ваўкавыскі раён, Гродзенская вобласць). *Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гісторыя.* 2026;3:5–19.
EDN: TYGLSJ

For citation:
Harshkou AD. Previous research results for new Palaeolithic site Belyja rechki – 1 (Volkovysk District, Grodno Region). *Journal of the Belarusian State University. History.* 2026;3: 5–19. Belarusian.
EDN: TYGLSJ

Автор:
Александр Дмитриевич Горшков – кандидат исторических наук; доцент кафедры истории Беларуси, археологии и специальных исторических дисциплин факультета истории, коммуникации и туризма.

Author:
Aliaksandr D. Harshkou, PhD (history); associate professor at the department of history of Belarus, archeology and special historical disciplines, faculty of history, communication and tourism.
gorshkov_ad@grsu.by
https://orcid.org/0000-0003-2805-0678

CC BY NC

в котором найдены материалы позднего палеолита в бассейне р. Росси, с зафиксированной стратиграфической позицией культуросодержащего горизонта.

Ключевые слова: археология; палеолит; свидерская культура; культурный слой; культуросодержащий горизонт; кремниевые артефакты.

ПАПЯРЭДНІЯ ВЫНІКІ ДАСЛЕДАВАННЯЎ НОВАГА ПОМНІКА ПАЛЕАЛІТУ БЕЛЫЯ РЭЧКІ – 1 (ВАЎКАВЫСКІ РАЁН, ГРОДЗЕНСКАЯ ВОБЛАСЦЬ)

А. Д. ГАРШКОЎ[1*]

[1*]*Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы, вул. Ажэшкі, 22, 230023, г. Гродна, Беларусь*

Анатацыя. Уводзяцца ў навуковы зварот вынікі даследаванняў новага археалагічнага помніка Белыя рэчкі – 1. Аб'ект быў адкрыты аўтарам вясной 2025 г. падчас разведкі ў наваколлях г. п. Рось (Ваўкавыскі раён, Гродзенская вобласць), якая праводзілася з мэтай абследавання тэрыторыі на наяўнасць помнікаў эпохі фінальнага палеаліту. Летам таго ж года ў рамках археолага-этнаграфічнай практыкі студэнтаў-гісторыкаў і дзейнасці студэнцкай навукова-даследчай археалагічнай лабараторыі праводзіліся раскопкі і шурфоўка на дадзенай тэрыторыі. У канцы палявога сезона была сабрана калекцыя матэрыялаў (728 прадметаў), якія залягалі ў культурным пласце і культуразмяшчальным гарызонце. Знаходжанне помніка ў зоне распаўсюджання адкладаў верхнепаазерскага часу дазволіла аднесці частку знаходак, якія залягаюць у пясчана-жвіровых адкладах, да позняга палеаліту. Дадзеная гіпотэза пацвярджаецца тэхніка-марфалагічнымі характарыстыкамі артэфактаў і іх вонкавым станам. Акрамя гэтага, у культурным пласце зафіксаваны прадметы, якія адносяцца да фінальнага палеаліту, магчыма, мезаліту, перыяду ад позняга неаліту да ранняга жалезнага веку, Навейшага часу. Такім чынам, помнік Белыя рэчкі – 1 з'яўляецца першым аб'ектам, дзе знойдзены матэрыялы позняга палеаліту ў басейне р. Росі, з зафіксаваным стратыграфічным становішчам культуразмяшчальнага гарызонту.

Ключавыя словы: археалогія; палеаліт; свідэрская культура; культурны пласт; культуразмяшчальны гарызонт; крамянёвыя артэфакты.

PREVIOUS RESEARCH RESULTS FOR NEW PALAEOLITHIC SITE BELYJA RECHKI – 1 (VOLKOVYSK DISTRICT, GRODNO REGION)

A. D. HARSHKOU[a]

[a]*Yanka Kupala State University of Grodno, 22 Azheshki Street, Grodna 230023, Belarus*


Abstract. The results of studies of a new archaeological site Belyja rechki – 1 (Volkovysk District, Grodno Region) are introduced into scientific circulation. The object was discovered by the author in the spring of 2025 during exploration near the urban settlement of Ross, which was carried out to survey the area for the presence of sites of the final Palaeolithic period. In the summer of the same year, excavations and prospecting of the area were carried out as part of the archaeological and ethnographic practice of history students and the activities of the student research archaeological laboratory. The result of the field season was a collection of materials in the amount of 728 items that were located in the cultural layer and the culture-containing horizon. The placement of the site in the distribution zone of deposits of the upper Poozersky time made it possible to associate some of the items that were located in sand and gravel deposits with the late Palaeolithic period. This hypothesis is confirmed by the technical and morphological characteristics of the artifacts and their external condition. In addition to these materials, the cultural layer contains objects that belong to the final Palaeolithic, possibly the Mesolithic, the late Neolithic – early Iron Age, and the Modern Time. Thus, the site Belyja rechki – 1 is the first object with materials of the late Palaeolithic in Ross River basin with a recorded stratigraphic position of the culture-containing horizon.

Keywords: archeology; Palaeolithic; Swiderian culture; cultural layer; culture-containing horizon; flint artifacts.

Уводзіны

Помнік Белыя рэчкі – 1 размешчаны на левым борце Роскай (Расінскай) ледавіковай лагчыны, у 1 км на ўсход ад правага рукава сучаснага рэчышча р. Росі, на поўнач ад роскага лясніцтва. Стаянка была адкрыта аўтарам у 2025 г. падчас паверхневых збораў на грунтовай дарозе, якая ідзе па лесе ад г. п. Рось да шашы Р44 «Гродна – Ружаны – Івацэвічы» і в. Карпаўцы Ваўкавыскага раёна. У гэтым жа годзе быў

закладзены шурф 1 плошчай 1 м^2, які ў далейшым быў упісаны ў раскоп 1 плошчай 18 м^2 (3 × 6 м). Акрамя гэтага, для вызначэння плошчы помніка і даследавання яго стратыграфічных асаблівасцей на тэрыторыі дадзенага аб'екта былі закладзены два шурфы памерам 2 × 2 м, якія распрацоўваліся на глыбіню да 2 м (мал. 1). Экспларацыя раскопу 1 і шурфаў 2 і 3 праводзілася ў рамках археолага-этнаграфічнай практыкі студэнтаў першага курса гістарычнага факультэта Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы і плана работы студэнцкай навукова-даследчай археалагічнай лабараторыі. У выніку праведзеных даследаванняў былі назапашаны матэрыялы і даныя, увядзенне якіх у навуковы зварот дазволіць вылучыць новы помнік палеаліту ў басейне р. Росі, што і з'яўляецца мэтай дадзенага артыкула.



Мал. 1. Размяшчэнне помніка Белыя рэчкі – 1 з пазначанымі шурфамі 1–3 і раскопам 1
Fig. 1. The location of the Belyja rechki – 1 site with marked pits 1–3 and trench 1

Методыка даследавання

Паверхневыя зборы на помніку першапачаткова праводзіліся без прывязкі матэрыялаў да мясцовасці, толькі з іх лакалізацыяй у межах грунтовай дарогі. Затым усе знаходкі прывязваліся да мясцовасці пры дапамозе GNSS-прыёмніка ETF M3 Plus у Сусветнай геадэзічнай сістэме каардынат (World geodetic system 1984) з праекцыяй Меркатара. Распрацоўка шурфа 1 вялася механічнымі пластамі магутнасцю 0,1 м з зачысткай пасля зняцця кожнага слоя. Культурны пласт перабіраўся ўручную, знаходкі фіксаваліся ў межах пласта. У далейшым шурф 1 стаў паўднёва-заходнім квадратам раскопу 1, які быў арыентаваны меншымі бакамі па лініі поўнач – поўдзень і меў літарна-лічбавую нумарацыю квадратаў А – В (1–6). Распрацоўка вялася літалагічнымі (пласты 1 і 2) і механічнымі (пласты 3–6) пластамі магутнасцю 0,1 м. Дзярновы пласт здымаўся пры дапамозе рыдлёвак, затым праводзіліся ручная пераборка і фіксацыя матэрыялаў у межах квадрата. Астатняя ўскрытая тоўшча пласта прасейвалася праз сіта з ячэйкай памерам 0,2 см, а знаходкі фіксаваліся пры дапамозе тахеометра Trimble M3 у трохмернай сістэме каардынат. Артэфакты ў пластах 4–6 прывязваліся да мясцовасці толькі ў межах квадратаў. Распрацоўка шурфаў 2 і 3, якія размяшчаліся на супрацьлеглым баку грунтовай дарогі, праводзілася рыдлёўкамі, пасля адбываліся ручная пераборка глебы і прывязка знаходак да літалагічных пластоў у межах квадратаў.

У выніку праведзеных работ былі выяўлены асноўны культурны пласт, які залягаў у першых двух слаях, і культуразмяшчальны гарызонт са знаходкамі ў пясчана-жвіровых адкладах ніжэй за ўзровень мацерыка.

Апісанне стратыграфіі, высвятленне памераў зерняў і грануламетрыя асадкавых парод (пяскоў) выконваліся па методыцы І. Д. Зольнікава [1]. Апрацоўка крамянёвага інвентару праводзілася з апорай на тэхналагічны падыход, апісаны ў працах расійскіх (Я. Ю. Гіра, П. Я. Нехарошаў) і польскіх (Б. Гінтэр, Я. Казлоўскі) археолагаў [2; 3].

Тапаграфія і стратыграфія помніка

Як ужо згадвалася вышэй, помнік Белыя рэчкі – 1 знаходзіцца на левым борце Роскай (Расінскай) ледавіковай лагчыны. Яна ўтварылася ў выніку выворвання, выціскання і размыву [4, с. 84]. Уласна сама даліна р. Росі, якая перасякае Ваўкавыскае ледавіковае ўзвышша, канчаткова сфарміравалася ў позненеледавіковы час у выніку рэгрэсіўнай эрозіі. Падчас існавання Скідзельскага прыледавіковага возера, якое ўтварылася ў прыледавіковай зоне, яго сток адбываўся ў паўднёва-заходнім напрамку ў басейн р. Нараў і далей ўніз па р. Днепр [5, с. 9]. У адпаведнасці з картай чацвярцічных адкладаў помнік Белыя рэчкі – 1 знаходзіцца ў зоне распаўсюджання алювіяльных адкладаў верхнепаазерскага часу[1].

Стратыграфія, зафіксаваная ў шурфах і раскопе 1, падобная, аднак з-за рознай глыбіні распрацоўкі ў шурфах 2 і 3 дадаткова былі ўскрыты геалагічныя адклады без археалагічных матэрыялаў.

У шурфе 2 была зафіксавана наступная стратыграфія: дзярнова-падзолістая глеба цёмна-шэрага колеру (магутнасць пласта 0,10–0,25 м), шэрая глеба (магутнасць пласта 0,05–0,20 м), пясчана-жвіровыя адклады рудога колеру з гнёздамі пясчана-жвіровых адкладаў жоўтага колеру (магутнасць пласта 0,25–0,40 м), пясчана-жвіровыя адклады рудога колеру гарызантальна-слаістыя (магутнасць пласта 0,10–0,15 м), пясчана-жвіровыя адклады жоўтага колеру гарызантальна-слаістыя, якія падсцілаюцца галькай і камянямі (магутнасць пласта 0,03–0,10 м), пясок жоўта-бялёсага колеру гарызантальна-слаісты з вуглом залягання каля 80° і прапласткамі рудога супеску (магутнасць пласта 0,35–0,40 м). Акрамя гэтага, у заходнім і паўночным профілях быў ускрыты борт лагчыны, запоўнены пяском чырвона-бурага колеру гарызантальна-слаістым з вуглом залягання 60°.

Падобная стратыграфія зафіксавана і ў шурфе 3: дзярнова-падзолістая глеба цёмна-шэрага колеру (магутнасць пласта 0,10–0,25 м), шэрая глеба (магутнасць пласта 0,08–0,20 м), пясок рудога колеру (магутнасць пласта 0,45–0,65 м), бялёсы пясок з лінзамі рудога пяску (магутнасць пласта 0,10–0,15 м), пясчана-жвіровыя адклады рудога колеру (магутнасць пласта 0,15–0,50 м), пясок жоўта-бялёсага колеру гарызантальна-слаісты (магутнасць пласта 0,10–0,35 м), пясчана-жвіровыя адклады чырвона-бурага колеру з галькай (магутнасць пласта 0,10–0,45 м), пясчана-жвіровыя адклады шэра-карычневага колеру (магутнасць пласта 0,05–0,20 м).

Найбольш выразная стратыграфія ў раскопе 1 прадстаўлена ў квадраце А1, дзе быў першапачаткова закладзены шурф 1. Менавіта ў ім было зроблена паглыбленне для праходжання тоўшчы пясчана-жвіровых адкладаў, у якіх канцэнтраваліся крамянёвыя матэрыялы. У гэтым квадраце была зафіксавана наступная стратыграфія: дзярнова-падзолістая глеба цёмна-шэрага колеру (магутнасць пласта 0,08–0,12 м), шэрая глеба (магутнасць пласта 0,1–0,2 м), пясок рудога колеру (магутнасць пласта 0,35–0,60 м), пясчана-жвіровыя адклады рудога колеру (магутнасць пласта 0,10–0,35 м), пясчана-жвіровыя адклады чырвона-бурага колеру з галькай (магутнасць пласта 0,05–0,20 м), пясчана-жвіровыя адклады жоўта-бялёсага колеру (магутнасць пласта 0,2–0,3 м). Акрамя гэтага, у месцах, дзе знаходзіліся карані дрэў, зафіксавана наяўнасць пяску жоўта-карычневага колеру (магутнасць пласта 0,25–0,40 м) (мал. 2).



Мал. 2. Размяшчэнне культурнага пласта і культуразмяшчальнага гарызонту на заходнім профілі раскопу 1 помніка Белыя рэчкі – 1 (даследаванні 2025 г.)

Fig. 2. Location of the cultural layer and the culture-bearing horizon on the western profile of trench 1 of the Belyja rechki – 1 site (research of 2025)

Матэрыялы даследавання

У выніку праведзеных работ была назапашана калекцыя археалагічных матэрыялаў, у якую ўваходзяць крамянёвыя (721 адзінка), каменныя (2 адзінкі), касцяныя (2 адзінкі), металічныя (1 адзінка) прадметы і шлакі (2 адзінкі). Агульная колькасць артэфактаў складае 728 адзінак. Аналіз планіграфіі

[1]Карта чацвярцічных адкладаў Рэспублікі Беларусь : маштаб 1 : 1 250 000 // Нац. атлас Беларусі / рэдкал.: Р. І. Внукаў [і інш.]. Мінск : Кам. па зям. рэсурсах, геадэзіі і картаграфіі пры Савеце Міністраў Рэсп. Беларусь, 2002. С. 42–43.

ўскрытых участкаў дазваляе канстатаваць прывязку матэрыялаў да дзярновага слоя, шэрай глебы, якая яго падсцілае, і пясчана-жвіровых адкладаў, што залягаюць ніжэй пяску жоўта-карычневага колеру. У раскопе 1, нягледзячы на значныя біятурбацыі, звязаныя перш за ўсё з ростам дрэў (гэты факт пацвярджаецца не толькі стратыграфіяй, але і знаходкамі, якія былі зацягнуты каранямі сосен у ніжэйшыя пласты), прасочваецца пэўная канцэнтрацыя артэфактаў у яго паўднёва-ўсходняй частцы.

Сыравіна прадстаўлена двума варыянтамі. Першы варыянт – крэйдавы крэмень з радыяльнай унутранай структурай, колер і знешнія прыкметы якога змяняюцца ад цёмна-шэрага празрыстага да светла-шэрага непразрыстага крэменю. Жаўлачная скарынка звычайна вымытая, яе таўшчыня дасягае 0,1 мм. Падобная сыравіна шырока распаўсюджана ў ваколіцах гарадскіх пасёлкаў Рось і Краснасельскі. Другі варыянт – цёмна-шэры празрысты крэмень з невялікімі плямамі шэрага колеру. Жаўлачная скарынка крэйдавая, яе таўшчыня дасягае 0,2 мм. Выхады гэтай сыравіны намі зафіксаваны каля былога кар'ера завода жалезабетонных канструкцый.

У калекцыі адзначаецца наяўнасць прадметаў са знешнімі прыкметамі разбурэння, якое адбылося ў выніку ўздзеяння высокай тэмпературы. Усяго было зафіксавана 155 такіх адзінак, або 21,5 % ад колькасці калекцыі.

Паціна пераважна фіксуецца толькі сярод матэрыялаў, якія былі знойдзены ў культуразмяшчальным гарызонце. Агульная колькасць гэтых артэфактаў складае 106 адзінак, або 14,7 % ад колькасці ўсёй калекцыі і 73,2 % ад колькасці матэрыялаў, якія залягалі ў пластах 3–6.

Тэхніка-марфалагічныя асаблівасці калекцыі дазваляюць вылучыць наступныя катэгорыі артэфактаў: нуклеусы і іх фрагменты, тэхналагічныя сколы, дэбітаж, фармальныя прылады, адходы вытворчасці. Асобна намі разглядаюцца косныя рэшткі і металічныя артэфакты, якія прадстаўлены фрагментамі сківіц жывёл і гільзай. Агульная тэхніка-марфалагічная структура калекцыі прадстаўлена ў табл. 1–3.

Табліца 1

Агульная тэхніка-марфалагічная структура калекцыі, атрыманай у выніку правядзення паверхневых збораў у 2025 г.

Table 1

The general technical and morphological structure of the collection obtained as a result of surface collections in 2025

Марфалагічная катэгорыя	Артэфакты	Колькасць	Усяго
Сыравіна	Жаўлакі і іх фрагменты са слядамі апрацоўкі	3	3
Нуклеусы і іх фрагменты	Нуклеусы	2	3
	Рэшткавыя фрагменты нуклеусаў	1	
Тэхналагічныя сколы	Рабрыстыя пласціны і фрагменты аналагічных пласцін	2	2
Дэбітаж	Адшчэпы і фрагменты адшчэпаў	7	16
	Пласціны і фрагменты пласцін	3	
	Лускаватыя сколы	1	
	Лускавінкі	5	
Фармальныя прылады	Натуральныя абломкі рэтушаваныя	1	18
	Адшчэпы рэтушаваныя і фрагменты аналагічных адшчэпаў	11	
	Пласціны рэтушаваныя і фрагменты аналагічных пласцін	2	
	Пласціны з усечаным рэтушшу канцом	1	
	Разцы	1	
	Скрабкі	1	
	Скробачы	1	
Адходы вытворчасці	Абломкі	4	4
Усяго		*46*	*46*

Падчас паверхневых збораў, якія праводзіліся выключна ў пачатку лясной дарогі, што ідзе ад ляснiцтва да шашы Р44 «Гродна – Ружаны – Івацэвічы» і в. Карпаўцы Ваўкавыскага раёна, былі сабраны 46 крамянёвых артэфактаў. Сярод іх вылучаюцца наступныя марфалагічныя катэгорыі: сыравіна, нуклеусы

і іх фрагменты, тэхналагічныя сколы, дэбітаж, фармальныя прылады і адходы вытворчасці.

Сыравіна прадстаўлена фрагментамі крамянёвых жаўлакоў са слядамі апрацоўкі (3 адзінкі). На адным экзэмпляры зафіксавана эалічная паверхня. Памеры артэфактаў наступныя: даўжыня складае ад 2,31 да 4,52 см, шырыня – ад 3,12 да 5,63 см, таўшчыня – ад 1,41 да 2,64 см.

Нуклеусы і іх фрагменты прадстаўлены ўласна нуклеусамі і рэшткавым фрагментам нуклеуса.

Нуклеусы (2 адзінкі) прадстаўлены аднапляцовачным экзэмплярам ад пласцін і адшчэпаў і двухпляцовачным экзэмплярам ад пласцін. Пляцоўкі сфарміраваны адзінарным франтальным сколам на натуральнай паверхні і некалькімі франтальнымі сколамі. Фронт аднапляцовачнага нуклеуса скруглены, контрфронт неапрацаваны. У двухпляцовачнага экзэмпляра фронт плоскі, контрфронт і бакі апрацаваны перпендыкулярнымі фронту сколамі. Вугал сколвання складае 87°, 84° і 73°. Памеры артэфактаў наступныя: даўжыня складае 7,1 і 7,0 см, шырыня – 3,5 і 3,0 см, таўшчыня – 4,20 і 1,97 см адпаведна.

У групу рэшткавых фрагментаў нуклеусаў (1 адзінка) намі залічаны фрагменты спецыяльна апрацаваных жаўлакоў з негатывамі рэгулярных сколаў-загатовак, якія, аднак, не могуць дакладна быць аднесены да аднапляцовачных, двухпляцовачных або шматпляцовачных нуклеусаў. Памеры артэфакта наступныя: даўжыня складае 2,52 см, шырыня – 3,41 см, таўшчыня – 1,53 см.

Да тэхналагічных сколаў намі аднесены фрагменты рабрыстых пласцін.

Рабрыстыя пласціны і фрагменты аналагічных пласцін (2 адзінкі) прадстаўлены выключна фрагментаванымі экзэмплярамі. Жаўлачная скарынка зафіксавана на адным артэфакце. На ўсіх прадметах сфарміраваны выемкі паўстромкай дарсальнай рэтушшу. Памеры артэфактаў наступныя: даўжыня складае 3,11 і 3,71 см, шырыня – 1,22 і 1,61 см, таўшчыня – 0,42 і 0,51 см адпаведна.

Дэбітаж прадстаўлены адшчэпамі і фрагментамі адшчэпаў, пласцінамі і фрагментамі пласцін, лускаватым сколам, лускавінкамі.

Адшчэпы і фрагменты адшчэпаў (7 адзінак) прадстаўлены цэлым артэфактам (1 адзінка) і фрагментаванымі (6 адзінак) экзэмплярамі. Жаўлачная скарынка зафіксавана на адным артэфакце. Яшчэ ў аднаго прадмета прысутнічае лёгкі люстраж. У двух выпадках адзначаюцца сляды ўздзеяння высокай тэмпературы. Памеры артэфактаў наступныя: даўжыня складае ад 2,72 да 3,41 см, шырыня – ад 3,53 да 4,12 см, таўшчыня – ад 0,31 да 0,82 см.

Пласціны і фрагменты пласцін (3 адзінкі) прадстаўлены выключна фрагментаванымі экзэмплярамі. Адзін прадмет мае на дарсальнай паверхні сляды двухпляцовачнасці. На ўсіх знаходках прысутнічаюць сляды ўтылізацыі. Памеры артэфактаў наступныя: даўжыня складае ад 3,72 да 4,32 см, шырыня – ад 1,31 да 1,62 см, таўшчыня – ад 0,31 да 0,53 см адпаведна.

Група лускаватых сколаў прадстаўлена адшчэпамі, якія былі атрыманы падчас эксплуатацыі нуклеусаў шматпляцовачных з выкарыстаннем біпалярнай (контрударнай) тэхнікі. Выяўлены экзэмпляр цэлы, падскарыністы, на ім фіксуюцца сляды ўтылізацыі. Памеры артэфакта наступныя: даўжыня складае 3,42 см, шырыня – 4,23 см, таўшчыня – 0,41 см.

У групу лускавінак залічаны сколы (5 адзінак) памерам не больш за 2 см у дыяметры. Жаўлачная скарынка прысутнічае на двух прадметах. На адной лускавінцы зафіксаваны лёгкі люстраж, яшчэ на адным артэфакце – лёгкая паціна блакітнага колеру і люстраж.

Фармальныя прылады прадстаўлены натуральным абломкам рэтушаваным, адшчэпамі і пласцінамі рэтушаванымі, а таксама фрагментамі аналагічных адшчэпаў і пласцін, разцом, скрабком, скробачам.

Натуральны абломак рэтушаваны (1 адзінка) уяўляе сабой акатаны фрагмент крамянёвага жаўлака з участкам паўстромкай рэтушы. Памеры артэфакта наступныя: даўжыня складае 3,51 см, шырыня – ад 32 см, таўшчыня – 2,22 см.

Адшчэпы рэтушаваныя і фрагменты аналагічных адшчэпаў (11 адзінак) прадстаўлены выключна цэлымі экзэмплярамі. Падчас паверхневых збораў былі атрыманы скарыністыя (1 адзінка) і падскарыністыя (7 адзінак) адшчэпы. На дарсальнай паверхні некаторых прадметаў (5 адзінак) прысутнічае паўстромкая рэтуш. У чатырох выпадках паўстромкая вентральная рэтуш фарміруе выемку на адным з бакоў прадмета, яшчэ ў двух выпадках зафіксаваны дарсальная рэтуш і вентральная рэтуш. Аналагічным чынам у масіўнага адшчэпа сфарміраваны падобны да джала перфаратара ці праколкі ўчастак. Лёгкі люстраж ёсць на двух артэфактах. Яшчэ ў аднаго прадмета прысутнічаюць паціна малочна-блакітнага колеру, сляды забітасці і люстраж. Памеры артэфактаў наступныя: даўжыня складае ад 2,69 да 5,87 см, шырыня – ад 2,35 да 6,54 см, таўшчыня – ад 0,54 да 2,22 см.

Пласціны рэтушаваныя і фрагменты аналагічных пласцін (3 адзінкі) прадстаўлены цэлымі (2 адзінкі) або фрагментаванымі (1 адзінка) экзэмплярамі. На адным артэфакце фіксуюцца сляды жаўлачнай скарынкі. Пласціна і фрагмент пласціны былі зняты з двухпляцовачных монафрантальных нуклеусаў. На гэтых прадметах паўстромкай дарсальнай рэтушшу сфарміраваны выемкі. Яшчэ адзін экзэмпляр прадстаўлены пласцінай з усечаным рэтушшу канцом. Дыстальная частка выдалена і аформлена з дапамогай паўстромкай дарсальнай рэтушы. Памеры артэфактаў наступныя: даўжыня складае ад 2,71 да 4,52 см, шырыня – ад 1,29 да 2,31 см, таўшчыня – ад 0,34 да 0,41 см.

Разец бакавы на зломе загатоўкі мае выгляд мікрапласцінкі падскарыністай. На яго паверхні прысутнічае лёгкі люстраж. Памеры артэфакта наступныя: даўжыня складае 2,50 см, шырыня – 0,61 см, таўшчыня – 0,32 см.

Скрабок канцавы выкананы на адшчэпе падскарыністым. Ён мае прамую працоўную частку, сфарміраваную паўстромкай рэтушшу на вентральнай паверхні. На скрабку фіксуюцца сляды ўтылізацыі. Памеры артэфакта наступныя: даўжыня складае 3,85 см, шырыня – 3,22 см, таўшчыня – 1,65 см.

Скробач з калекцыі выкананы на адшчэпе падскарыністым, працоўная частка дадзенага экзэмпляра сфарміравана паўстромкай дарсальнай рэтушшу. Памеры артэфакта наступныя: даўжыня складае 3,11 см, шырыня – 2,89 см, таўшчыня – 0,86 см.

Адходы вытворчасці прадстаўлены выключна абломкамі крамянёвымі (4 адзінкі). Гэтыя фрагменты не маюць выразных прыкмет сколвання, але нясуць на сабе відавочныя сляды апрацоўкі. Тры прадметы з гэтай катэгорыі маюць сляды жаўлачнай скарынкі, яшчэ два прадметы – сляды ўздзеяння высокай тэмпературы. Памеры артэфактаў наступныя: даўжыня складае ад 2,31 да 3,65 см, шырыня – ад 2,74 да 3,89 см, таўшчыня – ад 0,78 да 1,21 см.

Табліца 2

Агульная тэхніка-марфалагічная структура калекцыі, атрыманай у выніку распрацоўкі шурфаў 1–3 у 2025 г.

Table 2

The general technical and morphological structure of the collection obtained as a result of the development of pits 1–3 in 2025

Марфалагічная катэгорыя	Артэфакты	Колькасць					Усяго
		Шурф 1	Шурф 2		Шурф 3		
		КП		КГ	КП	КГ	
Сыравіна і прэнуклеусы	Натуральныя абломкі	–	–	1	–	–	3
	Фрагменты жаўлака са слядамі апрацоўкі	–	–	–	–	1	
	Прэнуклеусы	–	–	1	–	–	
Нуклеусы і фрагменты нуклеусаў	Нуклеусы з біпалярным расшчапленнем	1	–	–	–	–	1
Тэхналагічныя сколы	Рабрыстыя адшчэпы і фрагменты аналагічных адшчэпаў	–	–	–	1	–	4
	Рабрыстыя пласціны і фрагменты аналагічных пласцін	–	–	1	–	–	
	Падрабрыстыя пласціны і фрагменты аналагічных пласцін	1	–	–	–	–	
	Бівентральныя сколы	–	–	–	1	–	
Дэбітаж	Адшчэпы і фрагменты адшчэпаў	7	1	3	–	2	20
	Лускаватыя сколы	1	–	–	–	–	
	Лускавінкі	2	–	2	2	–	
Фармальныя прылады	Адшчэпы рэтушаваныя і фрагменты аналагічных адшчэпаў	–	–	2	1	1	12
	Пласціны рэтушаваныя і фрагменты аналагічных пласцін	–	1	1	–	–	
	Скрабкі і фрагменты скрабкоў	–	–	2	–	1	
	Разцы	–	–	2	–	–	
	Кіркі	–	–	–	1	–	
Адходы вытворчасці	Абломкі	3	–	–	–	–	8
	Бівентральныя сколы	–	–	–	1	–	
	Мікраразцы	–	1	–	–	–	
	Шлакі	–	–	–	3	–	
Усяго		*15*	*3*	*15*	*10*	*5*	*48*

З а ў в а г а. У табл. 2 і 3 выкарыстоўваюцца наступныя скарачэнні: КП – культурны пласт; КГ – культуразмяшчальны гарызонт.

У выніку распрацоўкі шурфа 1 былі атрыманы 15 прадметаў, якія паходзяць выключна з культурнага пласта. Частка калекцыі, якая паходзіць з шурфаў 2 і 3, складае 18 і 14 адзінак адпаведна. У культурным пласце былі зафіксаваны 12 артэфактаў з шурфаў 2 і 3.

Табліца 3

Агульная тэхніка-марфалагічная структура калекцыі, атрыманай у выніку распрацоўкі раскопу 1 у 2025 г.

Table 3


The general technical and morphological structure of the collection obtained as a result of the development of excavation 1 in 2025

Марфалагічная катэгорыя	Артэфакты	Колькасць						Усяго
		КП		КГ				
		Пласт 1	Пласт 2	Пласт 3	Пласт 4	Пласт 5	Пласт 6	
Сыравіна	Жаўлакі і іх фрагменты	–	4	–	–	–	–	12
	Жаўлакі і іх фрагменты са слядамі апрацоўкі	1	7	–	–	–	–	
Нуклеусы і фрагменты нуклеусаў	Рэшткавыя фрагменты нуклеуса	1	–	1	–	–	–	4
	Нуклеусы з біпалярным расшчапленнем	–	2	–	–	–	–	
Тэхналагічныя сколы	Рабрыстыя адшчэпы і фрагменты аналагічных адшчэпаў	–	1	–	–	–	–	10
	Рабрыстыя пласціны і фрагменты аналагічных пласцін	–	3	–	–	–	1	
	Падрабрыстыя пласціны і фрагменты аналагічных пласцін	–	1	–	–	–	–	
	Сколы аднаўлення пляцоўкі нуклеуса і фрагменты аналагічных сколаў	–	1	–	–	–	–	
	Сколы падпраўкі пляцоўкі нуклеуса і фрагменты аналагічных сколаў	–	2	–	–	–	–	
	Сколы патанчэння плоскасці і фрагменты аналагічных сколаў	–	1	–	–	–	–	
Дэбітаж	Адшчэпы і фрагменты адшчэпаў	8	270	3	3	6	11	523
	Пласціны і іх фрагменты	–	4	–	2	2	–	
	Пласцінкі і іх фрагменты	–	7	–	1	1	–	
	Мікрапласцінкі і іх фрагменты	–	2	–	–	–	–	
	Лускаватыя сколы	–	2	–	–	–	–	
	Лускавінкі	6	173	–	3	9	10	
Фармальныя прылады	Адшчэпы рэтушаваныя і фрагменты аналагічных адшчэпаў	1	15	–	1	2	1	39
	Пласціны рэтушаваныя і фрагменты аналагічных пласцін	–	2	–	–	–	1	
	Мікрапласцінкі рэтушаваныя і фрагменты аналагічных мікрапласцінак	–	–	–	–	2	–	
	Пласціны і пласцінкі з прытупленым рэтушшу краем	–	–	–	1	–	1	
	Вастрыі, пласцінкі і мікрапласцінкі са скошаным рэтушшу краем	–	3	–	–	–	–	
	Скрабкі	–	–	–	–	1	–	
	Мікраскрабкі	–	1	–	–	1	1	
	Сярпы-нажы	–	1	–	–	–	–	
	Праколкі	1	1	–	–	–	–	
	Разцы	–	–	–	1	–	1	

Заканчэнне табл. 3
Ending of the table 3

Марфалагічная катэгорыя	Артэфакты	Колькасць						Усяго
		КП		КГ				
		Пласт 1	Пласт 2	Пласт 3	Пласт 4	Пласт 5	Пласт 6	
Адходы вытворчасці	Абломкі	5	36	–	–	–	1	44
	Разцовыя сколы	–	1	–	–	–	–	
	Мікраразцы	–	1	–	–	–	–	
Косткі і іх фрагменты	Фрагменты сківіц жывёлы	2	–	–	–	–	–	2
Металічныя вырабы	Гільзы	1	–	–	–	–	–	1
Каменныя вырабы	Адбойнікі	1	1	–	–	–	–	2
Усяго		*27*	*540*	*4*	*12*	*24*	*28*	*635*

У выніку экспларацыі раскопу 1 была атрымана частка калекцыі (635 адзінак). З іх 567 прадметаў былі знойдзены ў культурным слоі (пласты 1 і 2) і 68 прадметаў – у культуразмяшчальным гарызонце (пласты 3–6). У першых двух пластах зафіксаваны наступныя катэгорыі артэфактаў: сыравіна, нуклеусы і фрагменты нуклеусаў, тэхналагічныя сколы, дэбітаж, фармальныя прылады, адходы вытворчасці (мал. 3).



Мал. 3. Гарызантальная планіграфія размяшчэння знаходак у раскопе 1 помніка Белыя рэчкі – 1 (даследаванні 2025 г.)

Fig. 3. Horizontal planigraphy of the location of finds in trench 1 of the Belyja rechki – 1 site (research of 2025)

Сыравіна прадстаўлена натуральным абломкам, жаўлакамі, фрагментамі жаўлака са слядамі апрацоўкі і прэнуклеусам.

Жаўлакі і іх фрагменты (4 адзінкі) не маюць відавочных слядоў апрацоўкі. На двух з іх зафіксаваны прыкметы ўздзеяння высокай тэмпературы. Паціна малочна-блакітнага колеру прысутнічае на адным прадмеце. Памеры артэфактаў наступныя: даўжыня складае ад 2,52 да 6,66 см, шырыня – ад 3,23 да 6,60 см, таўшчыня – ад 0,41 да 3,35 см.

Колькасць жаўлакоў і фрагментаў жаўлакоў са слядамі апрацоўкі складае 9 адзінак. На адным экзэмпляры прысутнічаюць сляды ўздзеяння высокай тэмпературы. Яшчэ на двух прадметах фіксуецца паціна малочна-блакітнага колеру. Памеры артэфактаў наступныя: даўжыня складае ад 3,82 да 6,17 см, шырыня – ад 2,64 да 5,65 см, таўшчыня – ад 1,09 да 2,64 см.

Нуклеусы і фрагменты нуклеусаў прадстаўлены рэшткавымі фрагментамі нуклеусаў і нуклеусамі з біпалярным расшчапленнем.

На паверхні рэшткавага фрагмента нуклеусаў ёсць паціна блакітнага колеру, сляды акатанасці і люстраж. Фрагментацыя экзэмпляра адбылася падчас распрацоўкі раскопу 1. Памеры артэфакта наступныя: даўжыня складае 4,21 см, шырыня – 3,22 см, таўшчыня – 1,51 см.

Нуклеусы з біпалярным расшчапленнем (3 адзінкі) з'яўляюцца нуклеусамі шматпляцовачнымі ад адшчэпаў (лускаватых сколаў). Іх эксплуатацыя вялася пры дапамозе біпалярнай (контрударнай) тэхнікі расшчаплення. Жаўлачная скарынка зафіксавана на адным прадмеце. Яшчэ на адным экзэмпляры ёсць невялікі ўчастак паўстромкай рэтушы. Памеры артэфактаў наступныя: даўжыня складае ад 2,88 да 4,72 см, шырыня – ад 2,59 да 7,75 см, таўшчыня – ад 0,93 да 1,76 см.

Тэхналагічныя сколы прадстаўлены рабрыстымі і падрабрыстымі сколамі (адшчэпамі, пласцінамі і пласцінкамі) і фрагментамі аналагічных сколаў, сколамі падпраўкі і аднаўлення пляцовак нуклеусаў, сколамі патанчэння плоскасці.

Рабрыстыя адшчэпы і фрагменты аналагічных адшчэпаў (2 адзінкі) прадстаўлены выключна цэлымі экзэмплярамі. Жаўлачная скарынка зафіксавана ў адным выпадку. Сляды акатанасці і забітасці, люстраж прысутнічаюць таксама на адным прадмеце. Яшчэ на адным артэфакце ёсць паўстромкая рэтуш на дарсальнай паверхні. Памеры артэфактаў наступныя: даўжыня складае 3,35 і 4,0 см, шырыня – 3,67 і 3,31 см, таўшчыня – ад 0,41 да 0,58 см адпаведна.

Рабрыстыя пласціны і фрагменты аналагічных пласцін (4 адзінкі) прадстаўлены цэлымі (3 адзінкі) і фрагментаванымі (1 адзінка) экзэмплярамі. Папярэчнае сячэнне знаходак трохвугольнае, жаўлачная скарынка зафіксавана на двух прадметах. На паверхні разглядаемых экзэмпляраў прысутнічаюць паціна блакітнага колеру, сляды акатанасці і забітасці, люстраж (у адным выпадку). Памеры артэфактаў наступныя: даўжыня складае ад 3,31 да 6,82 см, шырыня – ад 1,10 да 2,79 см, таўшчыня – ад 0,88 да 1,23 см.

Падрабрыстыя пласціны і фрагменты аналагічных пласцін (2 адзінкі) прадстаўлены выключна фрагментаванымі экзэмплярамі. Адзін прадмет на дарсальнай паверхні мае негатывы сустрэчнага сколвання. Паціна белага колеру, сляды акатанасці і люстраж прысутнічаюць на ўсіх артэфактах. Памеры артэфактаў наступныя: даўжыня складае 3,45 і 4,21 см, шырыня – 2,34 і 3,22 см, таўшчыня – 0,45 і 1,51 см адпаведна.

Скол аднаўлення пляцоўкі нуклеуса зняты з боку фронту ядрышча. На прадмеце прысутнічае другасная апрацоўка ў выглядзе дробнай дарсальнай і вентральнай рэтушы. Памеры артэфакта наступныя: даўжыня складае 3,58 см, шырыня – 4,41 см, таўшчыня – 0,62 см.

Колькасць сколаў падпраўкі пляцоўкі нуклеуса і фрагментаў аналагічных сколаў складае 2 адзінкі. На прадметах прысутнічаюць паціна блакітнага колеру, сляды акатанасці, забітасці і люстражу. Памеры артэфактаў наступныя: даўжыня складае ад 2,52 да 3,58 см, шырыня – ад 3,23 да 4,41 см, таўшчыня – ад 0,41 да 0,62 см.

Да групы сколаў патанчэння плоскасці залічаны адшчэпы з вострым вуглом сколвання (больш за 50°), якія былі зняты для патанчэння загатоўкі. На паверхні прадмета з калекцыі прысутнічае жаўлачная скарынка. Памеры артэфакта наступныя: даўжыня складае 1,80 см, шырыня – 2,11 см, таўшчыня – 0,44 см.

Дэбітаж прадстаўлены адшчэпамі, пласцінамі, пласцінкамі, мікрапласцінкамі і іх фрагментамі, лускаватымі сколамі, лускавінкамі.

Адшчэпы і фрагменты адшчэпаў (298 адзінак) прадстаўлены цэлымі (30 адзінак) і фрагментаванымі (268 адзінак) экзэмплярамі. Жаўлачная скарынка зафіксавана на 45 артэфактах, сляды ўтылізацыі – на 12 прадметах. Прыкметы ўздзеяння высокай тэмпературы зафіксаваны ў 106 выпадках. Таксама на 17 адшчэпах і фрагментах адшчэпаў прысутнічаюць паціна малочна-блакітнага колеру, сляды акатанасці і люстраж. Памеры артэфактаў наступныя: даўжыня складае ад 2,14 да 5,10 см, шырыня – ад 1,47 да 5,22 см, таўшчыня – ад 0,27 да 2,0 см.

Пласціны і фрагменты пласцін (4 адзінкі) прадстаўлены выключна фрагментаванымі экзэмплярамі. Адзін з прадметаў на дарсальнай паверхні нясе негатывы сустрэчнага сколвання. Памеры артэфактаў наступныя: даўжыня складае ад 3,52 да 4,61 см, шырыня – ад 1,28 да 2,22 см, таўшчыня – ад 0,31 да 0,42 см.

Пласцінкі і іх фрагменты (7 адзінак) прадстаўлены толькі фрагментаванымі экзэмплярамі. У калекцыі з раскопу прысутнічаюць доўгія вузкія сколы, шырыня якіх складае ад 0,7 да 1,2 см. На адным артэфакце ёсць паціна малочна-блакітнага колеру. Памеры артэфактаў наступныя: даўжыня складае ад 2,52 да 4,34 см, шырыня – ад 0,81 да 1,15 см, таўшчыня – ад 0,31 да 0,42 см.

Колькасць мікрапласцінак і іх фрагментаў – 2 адзінкі. У калекцыі прысутнічаюць доўгія вузкія сколы шырынёй менш за 0,7 см. Сярод артэфактаў ёсць цэлы і фрагментаваны экзэмпляры. Памеры артэфактаў наступныя: даўжыня складае 2,34 і 2,67 см, шырыня – 0,57 і 0,63 см, таўшчыня – 0,28 і 0,33 см адпаведна.

Лускаватыя сколы (3 адзінкі) прадстаўлены выключна цэлымі экзэмплярамі. Памеры артэфактаў наступныя: даўжыня складае ад 2,12 да 3,90 см, шырыня – ад 3,16 да 4,23 см, таўшчыня – ад 0,34 да 0,77 см.

Лускавінкі прадстаўлены 183 экзэмплярамі. Жаўлачная скарынка зафіксавана на 33 прадметах. Паціна малочна-блакітнага колеру, сляды акатанасці і люстраж прысутнічаюць на 41 артэфакце. На чатырох прадметах ёсць сляды ўздзеяння высокай тэмпературы.

Фармальныя прылады ў калекцыі прадстаўлены адшчэпамі, пласцінамі, мікрапласцінкамі рэтушаванымі і фрагментамі аналагічных мікрапласцінак, вастрыём, кіркай, мікраскрабком, фрагментам сярпанажа, праколкай.

Адшчэпы рэтушаваныя і фрагменты аналагічных адшчэпаў (17 адзінак) прадстаўлены цэлымі (13 адзінак) і фрагментаванымі (5 адзінак) экзэмплярамі. Жаўлачная скарынка прысутнічае на шасці прадметах. Таксама на артэфактах сустракаецца плоская (1 адзінка) і паўстромкая (17 адзінак) рэтуш на дарсальнай (12 адзінак), вентральнай (3 адзінкі) і абедзвюх (1 адзінка) паверхнях. У двух выпадках паўстромкай дарсальнай або вентральнай рэтушшу сфарміравана выемка. На адным артэфакце фіксуюцца сляды ўтылізацыі. Паціна малочна-блакітнага колеру, сляды акатанасці і забітасці, люстраж прысутнічаюць на двух прадметах. Сляды ўздзеяння высокай тэмпературы зафіксаваны ў адным выпадку. Памеры артэфактаў наступныя: даўжыня складае ад 2,21 да 5,49 см, шырыня – ад 1,90 да 5,43 см, таўшчыня – ад 0,28 да 0,96 см.

Пласціны рэтушаваныя і фрагменты аналагічных пласцін (3 адзінкі) прадстаўлены цэлымі (2 адзінкі) і фрагментаваным (1 адзінка) экзэмплярамі. На дарсальнай паверхні аднаго артэфакта прысутнічаюць негатывы сустрэчнага сколвання. Жаўлачная скарынка зафіксавана на двух прадметах. Рэтуш паўстромкая (2 адзінкі) сустракаецца на дарсальнай (1 адзінка), а таксама дарсальнай і вентральнай (1 адзінка) паверхнях прадметаў з калекцыі. У адным выпадку вентральная паўстромкая рэтуш фарміруе выемку ў дыстальнай частцы загатоўкі. Памеры артэфактаў наступныя: даўжыня складае ад 2,21 да 3,44 см, шырыня – ад 1,6 да 1,9 см, таўшчыня – ад 0,23 да 0,28 см.

Пласцінкі і мікрапласцінкі са скошаным рэтушшу краем (2 адзінкі) прадстаўлены цэлымі экзэмплярамі. Яны выкананы на загатоўках, знятых з аднапляцовачных нуклеусаў. Жаўлачная скарынка прысутнічае на адным прадмеце. Дыстальная частка загатовак скошана паўстромкай дарсальнай рэтушшу (мал. 4, *14*). На мікрапласцінцы прысутнічаюць паціна белага колеру, сляды акатанасці і люстраж. Памеры артэфактаў наступныя: даўжыня складае 3,93 і 3,43 см, шырыня – 1,0 і 0,63 см, таўшчыня – 0,21 і 0,23 см.

Вастрыё з калекцыі ўяўляе сабой фрагментаваны экзэмпляр. Яно выканана на пласцінцы падскарыністай, дыстальная частка якой скошана паўстромкай дарсальнай рэтушшу. На прадмеце прысутнічаюць паціна малочна-блакітнага колеру, сляды акатанасці і люстраж. Памеры артэфакта наступныя: даўжыня складае 3,22 см, шырыня – 1,11 см, таўшчыня – 0,32 см.

Кірка ўяўляе сабой уніфасіяльную прыладу з трохвугольным папярэчным сячэннем са слядамі забітасці на адным з канцоў. Памеры артэфакта наступныя: даўжыня складае 6,30 см, шырыня – 3,45 см, таўшчыня – 3,89 см.

Мікраскрабок выкананы на адшчэпе, яго скругленая працоўная частка сфарміравана стромкай дарсальнай рэтушшу ў дыстальнай частцы загатоўкі. На адным прадмеце прысутнічаюць паціна малочна-блакітнага колеру, сляды акатанасці і люстражу. Памеры артэфакта наступныя: даўжыня складае 1,79 см, шырыня – 1,0 см, таўшчыня – 0,60 см.

Сярпы-нажы прадстаўлены дыстальным фрагментам, выкананым на падскарыністай пласціне. Працоўная частка прадмета сфарміравана паўстромкай дарсальнай рэтушшу. Памеры артэфакта наступныя: даўжыня складае 2,82 см, шырыня – 2,0 см, таўшчыня – 0,45 см.

Если основная функция лагерей для взрослого населения сводилась к эксплуатации рабочей силы и последующему уничтожению узников, то нацистские детские лагеря выполняли комплекс иных задач: медицинскую задачу (забор крови и проведение экспериментов), транспортно-распределительную задачу (сортировка и отправка детей в Германию) и воспитательно-идеологическую задачу (создание антисоветского резерва). Доступные архивные источники, фиксирующие факты геноцида населения Беларуси и его последствия, а также материалы упомянутого уголовного дела позволяют условно выделить несколько типов нацистских детских лагерей: детское гетто, детский донорский лагерь, детский пересыльный лагерь, донорско-распределительный детский лагерь, специализированный детский лагерь. Выявленные белые пятна (отсутствие подробной информации о лагере, функционировавшем в г. п. Паричи, количестве погибших в д. Спорковщизне и др.) открывают перспективы для дальнейшего научного поиска.

Библиографические ссылки

1. Корсак А. Месцы прымусовага ўтрымання насельніцтва Беларусі перыяду нацысцкай акупацыі: да пытання тэрміналогіі і тыпалагізацыі. *Беларускі гістарычны часопіс.* 2025;6:3–10. EDN: ZYXRNN.

2. Лобанок ВЕ, Климов ИФ, Романовский ВФ, Филимонов АА, редакторы. *Нацистская политика геноцида и «выжженной земли» в Белоруссии (1941–1944).* Минск: Беларусь; 1984. 271 с.

3. Белуга ЗИ, Каминский НИ, Манаенков АЛ, Семенова АВ, Факторович АА, Ховратович ИП и др., составители. *Преступления немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии, 1941–1944.* Липило ПП, Романовский ВФ, редакторы. Минск: Беларусь; 1965. 464 с.

4. Савоняко МЯ. *Немецко-фашистские лагеря на территории Белоруссии в годы Великой Отечественной войны, 1941–1944 гг.* [диссертация]. Минск: БГУ; 1993. 225 с. EDN: NLJQEV.

[31]Без срока давности. Беларусь: преступления нацистов и их пособников против мирного населения на оккупированной территории БССР в годы Великой Отечественной войны. Могилёвская область… С. 417–419.

[32]НАРБ. Ф. 1450. Оп. 1. Д. 4. Л. 196.

[33]Там же. Оп. 2. Д. 957. Л. 46.

[34]Там же. Д. 7. Л. 416–421 об.

5. Літвін АМ, Грэбень ЯА, Новікаў СЯ. *Вяртанне ў рабства: прымусовая праца насельніцтва Беларусі, 1941–1945 гг.* Лойка ВА, Паўлавіцкі СП, перакладчыкі; Літвін АМ, рэдактар. Мінск: Тэсей; 2010. 584 с.

6. Иоффе ЭГ. *Белорусские евреи. Трагедия и героизм: 1941–1945.* Минск: [б. и.]; 2003. 428 с.

7. Кулинок СВ. Карательная операция «Клетка обезьяны». В: Белорусский государственный музей истории Великой Отечественной войны. *Карательные операции нацистов против партизан и населения Беларуси, 1941–1944 гг. Материалы круглого стола, посвященного 80-й годовщине трагедии белорусской деревни Хатынь; 22 марта 2023 г.; Минск, Беларусь.* Минск: Республиканский институт высшей школы; 2023. с. 14–18.

8. Селеменев ВД. Нацистские карательные операции в Полоцко-Лепельской партизанской зоне (апрель – май 1944 г.). В: Демянюк АК, Петюкевич ТВ, Воинов ОЛ, Колобаева УА, Красноженова ЕЕ, Круковская ОЛ и др., редакторы. *Партизанский архив. Материалы Международного круглого стола «Нацистские карательные операции на территории Беларуси в годы Великой Отечественной войны»; 25 апреля 2024 г.; Минск, Беларусь. Выпуск 1.* Минск: Колорград; 2025. с. 102–116.

9. Морозов ДВ, Бординьон Э. Итальянские интернированные военные в нацистском лагере Шталаг-352 в Масюковщине (1943–1944). *Журнал Белорусского государственного университета. История.* 2021;4:54–63. DOI: 10.33581/2520-6338-2021-4-54-63.

10. Паўлаў УП. *Дзеці ліхалецця: дакументальныя нарысы.* Мінск: Паліграфкамбінат імя Я. Коласа; 2005. 412, [3] с.

11. Павлов ВП. *Дети лихолетья: документальные очерки и повести.* Минск: Беларуская навука; 2017. 398, [1] с.

12. Яковлев ДВ, составитель. *Дети войны. Материалы круглого стола «Детские дома в г. Витебске и Витебской области на временно оккупированной территории в годы Великой Отечественной войны, 1941–1944 гг.»; 2005 г.; Витебск, Беларусь.* Витебск: Витебская областная типография; 2007. 144, [4] с.

13. Александренко ЛА, Козак КИ, Кузьмичева ТА, составители. *Детство войны 1941–1945 гг.: живые свидетельства Беларуси.* Минск: И. П. Логвинов; 2012. 215 с.

14. Бездзель ВЯ. *Дзеці на акупаванай тэрыторыі Беларусі (1941–1944).* Коршук УК, рэдактар. Віцебск: Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт; 2013. 157 с. EDN: UKHGUL.

15. Steinert J-D. *Deportation und Zwangsarbeit. Polnische und sowjetische Kinder im nationalsozialistischen Deutschland und im besetzten Osteuropa, 1939–1945.* Essen: Klartext; 2013. 306 S.

16. Person K, Steinert J-D. *Przemysłowa concentration camp. The camp, the children, the trials.* [S. l.]: Palgrave Macmillan; 2023. 251 p. (The Holocaust and its contexts). DOI: 10.1007/978-3-031-13948-2.

17. Вахсман Н. *История нацистских концлагерей.* Москва: Центрполиграф; 2015. 698 с.

18. Красноженова ЕЕ, Асташкин ДЮ, Вычеров ДА, Хазов ВК. *Ленинградские дети в условиях оккупации Северо-Запада РСФСР в период Великой Отечественной войны (1941–1944 гг.).* Санкт-Петербург: Свое издательство; 2023. 125 с.

19. К'яры Б. *Штодзённасць за лініяй фронту: акупацыя, калабарацыя і супраціў у Беларусі (1941–1944 г.).* Баршчэўскі Л, перакладчык; Сагановіч Г, рэдактар. 2-е выданне. Мінск: [б. в.]; 2008. 389 с. (Бібліятэка часопіса «Беларускі гістарычны агляд»).

20. Benz W, Distel B, editors. *Der Ort des Terrors. Geschichte der nationalsozialistischen Konzentrationslager.* München: C. H. Beck; 2005–2009. 9 Bände.

21. Аристов СВ. Проблемы истории концентрационного лагеря Саласпилс (1941–1944 годы). *Вестник Томского государственного педагогического университета.* 2017;9:24–30. DOI: 10.23951/1609-624X-2017-9-24-30.

22. Аристов СВ. *Terra inkognita: система нацистских концлагерей на оккупированной территории СССР (1941–1944 гг.).* Москва: Яуза; 2022. 432 с. (Библиотека Российского военно-исторического общества).

23. Kangeris K, Neiburgs U, Vīksne R. *Aiz šiem vārtiem vaid zeme. Salaspils nometne, 1941–1944.* Rīga: Lauku Avīze; 2016. 431 lpp.

24. Kangeris K, Neiburgs U, Viksne R. *Beyond nazi crimes and Soviet propaganda. The Salaspils Camp in Latvia, 1941–1944.* [S. l.]: Central European University Press; 2025. 330 p.

25. Цыганок НЛ. *Осиповичи: трагические страницы.* Минск: Белорусская энциклопедия имени Петруся Бровки; 2020. 149, [2] с. (Беларусь. Трагедия и правда памяти).

Получена 08.06.2026 / исправлена 08.07.2026 / принята 08.07.2026.
Received 08.06.2026 / revised 08.07.2026 / accepted 08.07.2026.

УДК 94(47+57«1941/45»+930(476)

ИСТОРИЯ ЖЕНЩИН БЕЛАРУСИ В ГОДЫ ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЫ В РАБОТАХ ОТЕЧЕСТВЕННЫХ ИССЛЕДОВАТЕЛЕЙ

В. В. ЗДАНОВИЧ[1)]

[1)]*Брестский государственный университет им. А. С. Пушкина, бул. Космонавтов, 21, 224016, г. Брест, Беларусь*

Аннотация. Анализируются работы отечественных историков, посвященные участию женщин в Великой Отечественной войне. Отмечается, что данная тема не стала приоритетным направлением исследований. В советский период эта ситуация была обусловлена политикой руководства страны в отношении женщин-фронтовиков (им советовали не хвастаться своими заслугами). Причинами, по которым женская тема не выносилась на широкое научное обсуждение, являются представление советских исследователей о непригодности женщин к войне, основанное на их психобиологических характеристиках, и недоступность, а во многих случаях и отсутствие источников по данной теме. На современном этапе история женщин в Великой Отечественной войне продолжает оставаться историографическим дефицитом. Белорусская историография представлена в основном статьями и сборниками научных конференций. Не трансформировались в коллективную память и женские воспоминания о войне.

Ключевые слова: Великая Отечественная война; нацистская оккупационная политика; историография; источники; мемуары женщин; партизанская и подпольная борьба; движение Сопротивления.

ГІСТОРЫЯ ЖАНЧЫН БЕЛАРУСІ Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ Ў ПРАЦАХ АЙЧЫННЫХ ДАСЛЕДЧЫКАЎ

У. В. ЗДАНОВІЧ[1*]

[1*]*Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна, бул. Касманаўтаў, 21, 224016, г. Брэст, Беларусь*

Анатацыя. Аналізуюцца працы айчынных гісторыкаў, прысвечаныя ўдзелу жанчын у Вялікай Айчыннай вайне. Адзначаецца, што дадзеная тэма не стала прыярытэтным напрамкам даследаванняў. У савецкі перыяд такая сітуацыя была абумоўлена палітыкай кіраўніцтва дзяржавы ў дачыненні да жанчын-франтавікоў (ім раілі не хваліцца сваімі заслугамі). Прычынамі таго, што жаночая тэма не выносілася на шырокае навуковае абмеркаванне, з'яўляюцца ўяўленне савецкіх даследчыкаў пра непрыстасаванасць жанчын да вайны, заснаванае на іх псіхабіялагічных асаблівасцях, і недаступнаць, а ў многіх выпадках і адсутнасць крыніц па гэтай тэме. На сучасным этапе гісторыя жанчын у гады Вялікай Айчыннай вайны працягвае заставацца гістарыяграфічным дэфіцытам. Беларуская гістарыяграфія прадстаўлена пераважна артыкуламі і зборнікамі навуковых канферэнцый. Не ператварыліся ў калектыўную памяць і жаночыя ўспаміны пра вайну.

Ключавыя словы: Вялікая Айчынная вайна; нацысцкая акупацыйная палітыка; гістарыяграфія; крыніцы; жаночыя мемуары; партызанская і падпольная барацьба; рух Супраціўлення.

Образец цитирования:
Зданович УВ. Гісторыя жанчын Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны ў працах айчынных даследчыкаў. *Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гісторыя.* 2026;3:80–85.
EDN: GZLCRZ

For citation:
Zdanovich VV. History of women of Belarus during the Great Patriotic War in the works of domestic researchers. *Journal of the Belarusian State University. History.* 2026;3:80–85. Belarusian.
EDN: GZLCRZ

Автор:
Владимир Васильевич Зданович – доктор исторических наук, профессор; профессор кафедры истории Беларуси и специальных исторических дисциплин исторического факультета.

Author:
Vladimir V. Zdanovich, doctor of science (history), full professor; professor at the department of history of Belarus and special historical disciplines, faculty of history.
zdanovich.uladzimir@gmail.com

HISTORY OF WOMEN OF BELARUS DURING THE GREAT PATRIOTIC WAR IN THE WORKS OF DOMESTIC RESEARCHERS

V. V. ZDANOVICH[a]

[a]*Brest State A. S. Pushkin University, 21 Kasmanawtaw Boulevard, Brest 224016, Belarus*

Abstract. This article analyses the works of Russian historians devoted to women's participation in the Great Patriotic War. It notes that this topic has not become a research priority. During the Soviet period, it was also facilitated by the Soviet leadership's policy toward female front-line soldiers, who were advised not to boast about their achievements. Another reason why women's participation has not been the subject of widespread scholarly discussion is the Soviet researchers' notion of women's unsuitability for war, based on psychobiological characteristics, as well as the inaccessibility, and in many cases, absence, of sources. However, even today, the history of women in the Great Patriotic War remains a historiographical deficit. Belarusian historiography is represented primarily by articles and conference proceedings. Women's recollections of the war have not also been transformed into collective memory.

Keywords: the Great Patriotic War; nazi occupation policy; historiography; sources; women's memoirs; partisan and underground struggle; the Resistance movement.

Уводзіны

Даследаванне любой гістарычнай падзеі з'яўляецца складаным і працяглым працэсам. Асабліва гэта сцвярджэнне тычыцца вывучэння гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, якая ахоплівае розныя сферы дзейнасці дзяржавы і шматлікіх сацыяльных груп. Нягледзячы на тое што беларуская гістарыяграфія налічвае звыш 14 тыс. публікацый, асобныя аспекты дадзенай тэмы вывучаны і асветлены неаднолькава. Адной з такіх важных праблем з'яўляецца ўдзел жанчын у Вялікай Айчыннай вайне. Толькі ў баявых дзеяннях удзельнічалі не менш за 800 тыс. чалавек [1, с. 256]. Жанчыны Беларусі зрабілі ўнёсак у перамогу над нацызмам, змагаючыся з ворагам у партызанскіх атрадах і падполлі, працуючы ў савецкім тыле.

Мэтай дадзенага артыкула з'яўляецца аналіз апублікаваных гістарыяграфічных крыніц па разглядаемай праблеме. З улікам спецыфікі гістарыяграфічнага даследавання пры напісанні працы былі выкарыстаны прынцыпы гістарызму і комплекснасці, а таксама гісторыка-лагічны, параўнальна-гістарычны, праблемна-храналагічны і іншыя метады.

Удзел жанчын Беларусі ў Вялікай Айчыннай вайне (ацэнка беларускай гістарыяграфіі)

Гістарыяграфія ўдзелу жанчын у Вялікай Айчыннай вайне падзяляецца на два асноўныя перыяды: савецкі (з 1941 па канец 1991 г.) і беларускі (з канца 1991 г. па сённяшні дзень). У кожным з іх прасочваюцца пэўныя вехі, асаблівасці і спецыфіка. Ужо ў ваенныя часы з'явіліся першыя публікацыі па дадзенай праблеме. Іх выхаду ў значнай ступені садзейнічала жаночае добраахвотніцтва – унікальная з'ява ў гісторыі войн. Далейшае больш глыбокае вывучэнне праблемы замаруджвалася неспрыяльнымі ўмовамі першага пасляваеннага дзесяцігоддзя. На даследаванні ролі жанчын у Вялікай Айчыннай вайне адмоўна адбілася выступленне ў ліпені 1946 г. старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР М. І. Калініна, пасля якога ўдзельніцы баявых дзеянняў сталі «фигурой умолчания» [2, с. 571]. Аднак, нягледзячы на адзначаныя абставіны, вывучэнне жаночай тэматыкі цалкам не спынілася. Звесткі пра вядомых беларусак можна знайсці ў працах, якія ўбачылі свет у наступныя дзесяцігоддзі [3–6].

Сярод даследаванняў, прысвечаных разглядаемай тэматыцы, варта адзначыць кнігу В. С. Мурманцавай «Советские женщины в Великой Отечественной войне» [7]. Не адмаўляючы навуковай каштоўнасці працы, адзначым, што ў ёй у адпаведнасці з тагачаснай гістарыяграфічнай традыцыяй асноўная ўвага надаецца гераізму жанчын-франтавікоў і іх унёску ў Перамогу. Побытавыя і псіхалагічныя цяжкасці, з якімі сутыкаліся жанчыны на фронце, засталіся па-за ўвагай аўтара.

У гістарыяграфіі савецкага перыяду прыярытэт мела партызанская тэматыка. Пра барацьбу падпольшчыц і партызанак рэспублікі супраць нацысцкіх захопнікаў на часова акупаванай тэрыторыі Беларусі, жанчын, якія сваёй працай здабывалі перамогу над ворагам, расказвае ў сваіх мемуарах В. К. Якавенка (камандзір 99-й Беларускай партызанскай брыгады імя Д. Гуляева). Яго кніга першапачаткова была выдадзена ў 1980 г. у Маскве [8], а ў 1989 г. перавыдадзена ў Мінску.

Аўтары трохтомніка «Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны» прыводзяць даныя, якія пацвярджаюць, што ўзброеную барацьбу

супраць акупантаў вялі людзі розных нацыянальнасцей, узросту, полу, сацыяльнай прыналежнасці. У выданні адзначаецца, што асноўную масу партызан складалі рабочыя і калгаснікі (56,13 %), служачыя (20,55 %), ваеннаслужачыя (11,6 %) і навучэнцы (12,6 %). У той жа працы ёсць звесткі аб тым, што ў радах партызан змагаліся людзі розных узростаў: доля ўдзельнікаў партызанскага руху да 18 гадоў складала 8,87 %, ад 18 да 25 гадоў – 45,19, ад 26 да 45 гадоў – 42,33, ад 45 гадоў – 3,61 %. Усяго ў атрадах налічвалася 84 % мужчын і 16 % жанчын [9, с. 447]. Як вынікае з прыведзеных звестак, жанчыны з'яўляліся актыўнымі ўдзельніцамі гэтай барацьбы.

Жанчыны Беларусі змагаліся з нацыстамі не толькі на радзіме, але і далёка за яе межамі. Шырокавядомым быў жаночы партызанскі атрад «Радзіма», заснаваны 8 мая 1944 г., калі 37 жанчын уцяклі з канцлагера Эрувіль. Па некаторых звестках, гэты атрад быў адзіным жаночым атрадам. Яго дзейнасці прысвечаны артыкул А. Гусева «Ішлі ў бой дзяўчаты…: старонкі з гераічнай біяграфіі нашай зямлячкі лейтэнанта французскай арміі Надзеі Восіпаўны Лісавец» [10].

Даследаванне жаночай тэмы стрымлівалі меркаванні айчынных навукоўцаў аб тым, што паняцці «жанчыны» і «вайна» несумяшчальныя. Такія адносіны найбольш выразна перададзены ў назве кнігі С. Алексіевіч «У войны не женское лицо» [11].

Апублікаваныя гістарычныя крыніцы, а таксама мемуары сведчаць аб тым, што жанчыны, нават пацярпелыя ад рэпрэсій, актыўна ўдзельнічалі ў барацьбе з ворагам. У лісце першаму сакратару ЦК КП(б)Б П. Панамарэнку ад 25 снежня 1941 г. В. Харужая пісала: «Я гатова выконваць любую работу на фронце ці ў тыле. Я нічога не баюся. У душы накіпела столькі нянавісці, столькі гатоўнасці да барацьбы, столькі любові і жадання аддаць усю сябе, што я гатова ісці адна на цэлыя полчышчы фашысцкіх свалачэй»[1] [12, с. 150].

Найбольш распаўсюджанай у савецкі час формай захавання калектыўнай памяці аб вайне былі сустрэчы ветэранаў, на якіх яны дзяліліся сваімі ўспамінамі з малодшымі пакаленнямі. З цягам часу такія сустрэчы ператварыліся ў своеасаблівы рытуал. У сувязі з тым, што складнікам мерапрыемстваў выступаў павучальна-выхаваўчы кампанент, многія моманты жыцця ў гады Вялікай Айчыннай вайны былі практычна выключаны з успамінаў.

У 1990-я гг. з'явіліся новыя магчымасці для даследавання ваеннай гісторыі, але і на сучасным этапе вывучэнне ўдзелу жанчын у Вялікай Айчыннай вайне не стала прыярытэтным напрамкам даследаванняў.

Беларуская гістарыяграфія прадстаўлена пераважна артыкуламі і зборнікамі навуковых канферэнцый. Разам з тым з'явіліся выданні, падрыхтаваныя асобнымі аўтарамі. Пры аналізе літаратуры аб жыцці жанчын Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны нельга абысці ўвагай кнігу А. А. Грабёнкінай «Живая боль. Женщины и дети Брестского гарнизона (1941–1944)» [13]. Аснову выдання склалі запісаныя даследчыцай успаміны жанчын і дзяцей Брэсцкага гарнізона, якія засталіся ў жывых. Эмацыйнае ўспрыняцце кнігі ўзмацняюць фотаздымкі з фондаў мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой» і аддзела культуры Брэсцкага гарадскога выканаўчага камітэта, а таксама дзясяткі фатаграфій, падораных аўтару ўдзельнікамі гэтых трагічных падзей, іх роднымі і блізкімі.

У некаторых калектыўных выданнях па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ўтрымліваюцца звесткі пра жанчын. У раздзеле «Антифашистское сопротивление на территории Беларуси» фундаментальнай калектыўнай працы «Беларусь в годы Великой Отечественной войны, 1941–1945 гг.» жанчынам адведзены некалькі радкоў: «…93,3 % партызан у 1943 г. – мужчыны і 6,7 % – жанчыны, якія нараўне з мужчынамі стойка пераносілі ўсе цяжкасці паходнага жыцця. Яны былі мужнымі і знаходлівымі разведчыцамі і сувязнымі, даглядалі параненых і хворых, гатавалі ежу і мылі бялізну, удзельнічалі ў дыверсіях і іншых баявых аперацыях» [14, с. 225].

Характарызуючы падпольную барацьбу, даследчыкі называюць прозвішчы герояў Савецкага Саюза А. Мазанік, М. Осіпавай, Н. Траян, якія здзейснілі забойства В. Кубэ, удзельніц Віцебскага падполля на чале з В. Харужай, членаў падпольнай камсамольскай групы на станцыі Обаль Ф. Зянькову і З. Партнову [14, с. 233].

Звернем увагу на працу «Беларусь, 1941–1945. Подвиг. Трагедия. Память», у першай кнізе якой змешчаны артыкул А. Я. Паўлавай «Личный состав и кадры партизанских формирований». У рэчышчы разглядаемай праблемы асаблівую цікавасць выклікаюць старонкі, прысвечаныя ўдзелу жанчын у партызанскай барацьбе, ці, як адзначае аўтар, гендарнай праблеме. Падкрэсліваючы, што «адной з асаблівасцей партызанскай і падпольнай барацьбы было шырокае прыцягненне ў яе рады жанчын», даследчыца падмацоўвае свае высновы наступнымі данымі: на 1 жніўня 1943 г. доля жанчын сярод партызан складала 8,7 %, на 1 студзеня 1944 г. – 6,73 %, доля жанчын сярод загінуўшых партызан у 1943 г. складала 6 %, за ўвесь перыяд партызанскіх дзеянняў гэты паказчык роўны 4 %. А. Я. Паўлава піша: «Выніковая справаздача на 1 жніўня 1946 г. падае лічбу ў 45 242 чал. (16 %)» [15, с. 305].

Большасць лічбавых даных, прыведзеных у артыкуле, раней былі прадстаўлены А. Я. Паўлавай у абароненай кандыдацкай дысертацыі «Личный состав партизанских формирований Беларуси в годы

[1]Тут і далей пераклад на беларускую мову наш. – *У. З.*

Великой Отечественной войны (1941–1944 гг.): источники и методы анализа»[2].

Асаблівую каштоўнасць уяўляе змешчаны ў другой кнізе выдання «Беларусь, 1941–1945. Подвиг. Трагедия. Память» артыкул І. У. Нікалаевай «Женщины Беларуси в период германской оккупации». Раскрываючы асаблівасці нацысцкай палітыкі ў дачыненні да жанчын, даследчыца адзначае: «Германскія ўлады напярэдадні ваеннай кампаніі супраць СССР… не разглядалі жаночае насельніцтва ў якасці самастойнага аб'екта будучай акупацыйнай палітыкі… Правал "бліцкрыгу", няўдачы вермахта на савецка-германскім фронце і развіццё патрыятычнага руху Супраціўлення прымусілі кіраўніцтва Трэцяга рэйха ўжо вясной 1942 г. унесці неабходныя карэктывы ў сваю ўсходнюю палітыку… германскае кіраўніцтва вымушана было звярнуцца да распрацоўкі планаў уключэння мясцовых жанчын у сферу ваенна-эканамічных і палітычных інтарэсаў Трэцяга рэйха» [16, с. 67–68].

У сувязі з набліжэннем Чырвонай арміі да граніц Беларусі з другой паловы 1943 г. праца жанчын набывае выключнае значэнне. Гісторык падкрэслівае: «Загадам камандавання групы армій "Цэнтр" усё жаночае насельніцтва ва ўзросце ад 14 да 65 гадоў абавязвалася фактычна да неабмежаванага адбыцця прымусовых работ на карысць акупантаў» [16, с. 70].

Адначасова з выкарыстаннем працы жанчын на акупаванай тэрыторыі немцы праводзілі вярбоўку беларусак для працы ў Германіі. Распачатая на добраахвотнай аснове, яна ператварылася ў прымусовую мабілізацыю. Згодна з прыведзенымі СНК БССР данымі ў Германію былі вывезены амаль 238 тыс. жанчын, ці 59,6 % ад усіх беларускіх «остарбайтараў» [16, с. 71].

Адпраўленыя ў Германію беларускія жанчыны працавалі на ўзвядзенні абарончых збудаванняў, у сельскай гаспадарцы і ў ваеннай прамысловасці, а з восені 1942 г. жанчыны, знешнасць якіх «расава» адпавядала знешнасці немак, дапускаліся да працы ў хатняй гаспадарцы (абслугоўванне).

Прымусовая праца на акупаванай тэрыторыі, вываз людзей у Германію не выключалі і палітыкі масавага знішчэння насельніцтва, у выніку якога загінулі каля 240 тыс. жанчын [16, с. 78].

Пры рэалізацыі палітыкі ў дачыненні да жаночага насельніцтва акупанты абапіраліся на Усебеларускі жаночы камітэт пад кіраўніцтвам Г. Вайтанчышкі. Аднак усе намаганні акупантаў не прынеслі жадаемага выніку. Факты, пададзеныя І. У. Нікалаевай, сведчаць аб тым, што большасць жанчын сталі актыўнымі ўдзельніцамі партызанскага і падпольнага руху [16, с. 78].

Жанчыны адыгралі важную ролю ў арганізацыі патрыятычнай дзейнасці ў Беларусі ўжо летам і восенню 1941 г. Абапіраючыся на даныя са згаданых крыніц і ўспамінаў відавочцаў падзей, можна гаварыць аб удзеле ў падпольным руху на тэрыторыі акупаванай Беларусі каля 25 тыс. жанчын [16, с. 81]. Прадстаўніцтва жанчын у асяроддзі падпольшчыкаў можна патлумачыць умовамі акупацыйнага рэжыму, устаноўленага германскімі ўладамі ў гарадах. Жанчыны выклікалі значна менш падазрэнняў, чым мужчыны.

На ролю жанчын у партызанскім руху звярнула ўвагу І. У. Нікалаева. З улікам загінуўшых, а таксама агентурных разведчыкаў і сувязных статыстычныя даныя Беларускага штаба партызанскага руху сведчаць аб удзеле ў партызанскай барацьбе 45 242 жанчын (16 % ад усіх партызан). У Віцебскай вобласці жанчыны складалі каля 10 % партызан, а ў асобных брыгадах, як, напрыклад у Багушэўскай партызанскай брыгадзе, на іх долю прыпадала амаль 17 % ад усяго асабовага складу [16, с. 82]. Адзначым, што разглядаемы артыкул з'яўляецца скарочаным варыянтам абароненай у 2006 г. кандыдацкай дысертацыі І. У. Нікалаевай «Жанчыны Беларусі ў перыяд германскай акупацыі (1941–1944 гг.)»[3]. На жаль, гэта даследаванне з'яўляецца адзінай дысертацыяй па разглядаемай тэме.

Аўтары другога фундаментальнага выдання «Вклад белорусского народа в Победу в Великой Отечественной войне» больш дэталёва разгледзелі ўдзел беларускіх жанчын у еўрапейскім руху Супраціўлення, у першую чаргу гісторыю жаночага партызанскага атрада «Радзіма». Гісторыкі падкрэсліваюць: «Існаванне асобнага жаночага партызанскага атрада, тым больш на зямлі далёкай Францыі, – унікальная з'ява ў гісторыі руху Супраціўлення» [17, с. 152]. Адзначым, што кніга была перавыдадзена ў 2016 і 2020 гг.

Асобнай старонкай гісторыі жанчын Беларусі ў час Вялікай Айчыннай вайны з'яўляецца жыццё на акупаванай тэрыторыі. Германскія ўлады зыходзілі з таго, што «жанчын гэтай краіны можна выкарыстоўваць як паўнавартасную працоўную сілу, паколькі яны не толькі звыклыя да цяжкай мужчынскай працы, але і больш старанныя за мужчын» [18, с. 34].

Антыгуманная палітыка акупацыйных улад, якая суправаджалася масавым знішчэннем грамадзянскага насельніцтва, прывяла да таго, што жыхары апынуліся ў вельмі цяжкіх умовах. Я. А. Грэбень канстатуе: «Дадатковым фактарам, які ўплываў на матэрыяльнае становішча грамадзян, стала эксплуатацыя немцамі іх матэрыяльных рэсурсаў… Вымушаныя існаваць з новай уладай, большасць людзей у адносінах да яе прыстасоўваліся, але не прызнавалі сваёй, не лічылі для сябе ганебным гэтую ўладу падманваць…

[2] *Павлова Е. Я.* Личный состав партизанских формирований Беларуси в годы Великой Отечественной войны (1941–1944 гг.): источники и методы анализа : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.09. Минск : Белорус. гос. ун-т, 2003. 17 с.

[3] *Нікалаева І. У.* Жанчыны Беларусі ў перыяд германскай акупацыі (1941–1944 гг.) : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02. Мінск : Беларус. дзярж. пед. ун-т, 2006. 38 с.

Прыстасоўваючыся да сітуацыі, грамадзяне ўхіляліся ад выплаты падаткаў ці імкнуліся іх мінімізаваць, праводзілі махінацыі з карткамі, ухіляліся ад павіннасцей, каб захаваць сілы для выжывання… Акрамя фізічнага знішчэння, грамадзянскае насельніцтва Беларусі сутыкнулася з рэальнай пагрозай смерці на фоне экстрэмальных сацыяльна-эканамічных умоў. Наступствы такога расцягнутага ў часе генацыду выяўляліся паступова, але цалкам адпавядалі духу генеральнага плана "Ост". Подзвігам было само жыццё ва ўмовах акупацыі, паколькі захаваць яго, выжыць для будучыні было вельмі складана» [19, с. 491–493].

Пацвярджэннем дадзенай высновы з'яўляюцца факты, прыведзеныя аўтарамі зборніка артыкулаў «Разняволеная памяць. Прымусовая праца беларускіх грамадзян на акупаванай тэрыторыі Беларусі (1941–1944)» [20].

Асобае месца займае праведзеная аб'яднаннем «Гістарычная майстэрня ў Мінску» 4 сакавіка 2005 г. міжнародная канферэнцыя «Женщины во Второй мировой войне: история борьбы и выживания», прысвечаная непасрэдна жаночай тэматыцы. Асаблівую ўвагу неабходна звярнуць на артыкул К. І. Козака «Женщины Германии и Беларуси в войне: социализация образа и его восприятие». Характарызуючы жыццё жанчын на акупаванай тэрыторыі, аўтар адзначае, што яны павінны былі выконваць распараджэнні германскіх улад, за невыкананне іх маглі прыцягнуць да адказнасці. Нацысты выкарыстоўвалі карныя метады, у тым ліку масавае спаленне беларускіх вёсак разам з жыхарамі [18, с. 51]. Справядліваі абгрунтаванай з'яўляецца выснова гісторыка аб тым, што «на долю жанчын выпалі самыя страшныя выпрабаванні. Гэта і шматлікія спаленыя разам з жыхарамі вёскі, прымусовы вываз на чужыну ў рабства, прымусовая працоўная павіннасць па забеспячэнні сілкаваннем… Само мацярынства патрабавала самаахвяравання ў імя абароны дзяцей і сям'і» [18, с. 55].

Не абышлі ўвагай даследчыкі і знішчэнне нацыстамі яўрэйскага насельніцтва, сярод якога было нямала жанчын. Значная колькасць пытанняў па праблеме былі разгледжаны на міжнародных канферэнцыях, арганізаваных вышэйзгаданым аб'яднаннем. У апублікаваных матэрыялах канферэнцый утрымліваюцца звесткі аб жыцці жанчын у гады Вялікай Айчыннай вайны. Так, у дадатках да зборніка «Першая і Другая сусветныя войны: акупацыя і яе наступствы на Беларусі» змешчаны 15 успамінаў жанчын – сведкаў халакосту, былых вязняў канцлагераў, прымусовых рабочых [21, с. 213–234].

Падкрэсліваючы несумненную каштоўнасць матэрыялаў канферэнцыі, адзначым і сур'ёзныя недапрацоўкі асобных аўтараў і рэдактараў выдання, якія прывялі да з'яўлення на яго старонках недакладнасцей. Так, камандзірам партызанскага атрада падаецца Герой Савецкага Саюза Валянціна Шчэрбіна, а не Васіль Шчарбіна [21, с. 15, 55].

Каштоўнай крыніцай інфармацыі па разглядаемай праблеме застаюцца жаночыя ўспаміны. У 2005 г. у свет выйшла кніга «Шли девчонки по войне: книга воспоминаний», у якой апісана іншая вайна, вайна, пра якую расказалі жанчыны. Успамінаючы франтавыя будні, старшыня Камітэта жанчын – удзельніц Вялікай Айчыннай вайны Мінскай гарадской арганізацыі ветэранаў З. Корж адзначыла: «Я плачу, але пішу праўду. Мне давялося бачыць маладых, без рук і ног, дзяўчат. Іх плач, крыкі адчаю не маглі суцешыць ніякімі выгодамі, створанымі для іх у санаторыях і шпіталях. Тое, што мне давялося бачыць і перажыць, апісанню не паддаецца. Усе мы ў даўгу перад дзяўчатамі-салдатамі. Выконваючы воінскі абавязак перад Радзімай, яны пакутавалі і духоўна, і фізічна значна больш, чым мужчыны. Але не завагаліся і не адступілі… У гады ваеннага ліхалецця на жаночыя плечы кладзецца велізарная адказнасць: на іх папячэнні ва ўмовах хаосу, разбурэнняў, голаду, хвароб і насілля апынуліся малыя дзеці, знямоглыя старыя, гаспадарка» [22, с. 3–6]. Успаміны падзелены на чатыры часткі: «Салдаты Перамогі», «Працаўнікі тылу», «Партызанкі і падпольшчыцы», «Малалетнія вязні канцлагераў». Большасць успамінаў, змешчаных у выданні, належаць жанчынам-франтавікам. Практычна па-за ўвагай засталіся вязні канцлагераў: у кнізе апублікаваны толькі ўспаміны Н. Р. Лось і В. І. Марозавай, якія дзецьмі трапілі ў канцлагер Азарычы.

Пэўны фактычны матэрыял па тэме падаецца ў падрыхтаваных супрацоўнікамі аб'яднання «Гістарычная майстэрня ў Мінску» мемуарах жанчын, якія перажылі халакост [23–26].

Заключэнне

Праведзены гістарыяграфічны аналіз паказвае, што даследчыкамі выканана пэўная праца па вывучэнні гісторыі жанчын у гады Вялікай Айчыннай вайны. Але даводзіцца канстатаваць, што жаночая тэма не стала прадметам шырокага навуковага абмеркавання. Важкай прычынай узнікнення такой сітуацыі з'яўляецца недаступнаць, а ў многіх выпадках і адсутнасць крыніц па дадзенай тэме. У асноўным даследчыкі працуюць з апублікаванымі дакументамі, пераважна з фондамі партыйных і камсамольскіх арганізацый, успамінамі, у тым ліку матэрыяламі вуснай гісторыі. На жаль, магчымасці фіксацыі вуснай гісторыі скарачаюцца катастрафічна хуткімі тэмпамі. Нягледзячы на рост цікавасці даследчыкаў да абазначанай тэмы ў апошнія гады, гісторыя ўдзелу жанчын у Вялікай Айчыннай вайне пакуль яшчэ не напісана. Засталіся нераскры-

тымі пытанні франтавой паўсядзённасці, псіхалагічнай траўмы ваеннага часу. Далейшага вывучэння патрабуюць жыццё жанчын на акупаванай тэрыторыі Беларусі, лёс жанчын-ваеннапалонных, а таксама жанчын, вывезеных на прымусовую працу ў Германію. Дасягнутыя поспехі дазваляюць зрабіць выснову аб тым, што айчынныя гісторыкі маюць усё неабходнае, каб стварыць фундаментальную працу па праблеме.

Бібліяграфічныя спасылкі

1. Иванова ЮН. *Храбрейшие из прекрасных. Женщины России в войнах*. Москва: РОССПЭН; 2002. 266 с.
2. Габович М, редактор. *Память о войне. 60 лет спустя: Россия, Германия, Европа*. Москва: Новое литературное обозрение; 2005. 784 с.
3. Ваганава М. Савецкая жанчына ў Вялікай Айчыннай вайне. *Беларусь*. 1946;3:2–6.
4. Ваньшина ВИ. *Ратный подвиг советских женщин в годы Великой Отечественной войны*. Минск: Знание; 1989. 19 с.
5. Белановский А, Перепяченко П, составители. *Героини войны: очерки о женщинах – героях Советского Союза*. Москва: Госполитиздат; 1963. 719 с.
6. Ус А, складальнік. *Жанчыны Савецкай Беларусі*. Мінск: Дзяржаўнае выдавецтва БССР; 1954. 569 с.
7. Мурманцева ВС. *Советские женщины в Великой Отечественной войне*. Москва: Мысль; 1979. 292 с.
8. Яковенко ВК. *Партизанки*. Москва: Воениздат; 1980. 304 с.
9. Кузьмин АТ, редактор. *Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны. Том 3*. Минск: Беларусь; 1985. 531 с.
10. Гусеў А. Ішлі ў бой дзяўчаты…: старонкі з гераічнай біяграфіі нашай зямлячкі лейтэнанта французскай арміі Надзеі Восіпаўны Лісавец. *Беларусь*. 1979;5:6–7.
11. Алексиевич СА. *У войны не женское лицо*. Минск: Мастацкая літаратура; 1985. 317 с.
12. Платонов РП, составитель. *Белоруссия, 1941-й: известное и неизвестное. По документам Национального архива Республики Беларусь*. Минск: БелНИИДАД; 2000. 262 с.
13. Гребенкина АА. *Живая боль. Женщины и дети Брестского гарнизона (1941–1944)*. Минск: Беларусь; 2008. 174 с.
14. Коваленя АА, редактор. *Беларусь в годы Великой Отечественной войны, 1941–1945 гг*. Минск: БелТА; 2005. 544 с.
15. Павлова ЕЯ. Личный состав и кадры партизанских формирований. В: Коваленя АА, редактор. *Беларусь, 1941–1945. Подвиг. Трагедия. Память. Книга 1*. Минск: Беларуская навука; 2010. с. 293–322.
16. Николаева ИВ. Женщины Беларуси в период германской оккупации. В: Коваленя АА, редактор. *Беларусь, 1941–1945. Подвиг. Трагедия. Память. Книга 2*. Минск: Беларуская навука; 2010. с. 67–86.
17. Коваленя АА, редактор. *Вклад белорусского народа в Победу в Великой Отечественной войне*. Минск: Беларуская навука; 2015. 495 с.
18. Козак КИ. Женщины Германии и Беларуси в войне: социализация образа и его восприятие. В: Балакирев ВФ, Козак КИ, редакторы. *Женщины во Второй мировой войне: история борьбы и выживания. Материалы Международной научно-практической конференции; 4 ноября 2005 г.; Минск, Беларусь*. Минск: И. П. Логинов; 2006. с. 7–56.
19. Гребень ЕА. *Гражданское население Беларуси в условиях немецкой оккупации (1941–1944)*. Минск: Белорусский государственный аграрный технический университет; 2016. 496 с.
20. Літвін АМ, рэдактар. *Разняволеная памяць. Прымусовая праца беларускіх грамадзян на акупаванай тэрыторыі Беларусі (1941–1944)*. Мінск: Медысонт; 2010. 216 с.
21. Балакіраў ВФ, Козак КІ, рэдактары. *Першая і Другая сусветныя войны: акупацыя і яе наступствы на Беларусі. Матэрыялы Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі; 22 кастрычніка 2005 г.; Мінск, Беларусь*. Мінск: [б. в.]; 2006. 256 с.
22. Корж ЗВ, составитель. *Шли девчонки по войне: книга воспоминаний*. Минск: Беларускі кнігазбор; 2005. 284 с.
23. Давыдова ГР. *От Минска до Ла-Манша, или Дорогами холокоста: документальное повествование*. Минск: Четыре четверти; 2000. 231 с.
24. Марголина СМ. *Остаться в живых*. Минск: Натако; 1997. 67 с.
25. Крапина МИ, Рейзман ФВ, составители. *Жива… да, я жива! Минское гетто в воспоминаниях Майи Крапиной и Фриды Рейзман. Материалы и документы. Выпуск 2*. Минск: Историческая мастерская в Минске; 2005. 258 с.
26. Завалер Г, Гальперина Р. *Спасенные из ада: жизнь и судьба. Выпуск 1*. Минск: Историческая мастерская в Минске; 2004. 136 с.

Атрымана 29.06.2026 / выпраўлена 02.07.2026 / прынята 15.07.2026.
Received 29.06.2026 / revised 02.07.2026 / accepted 15.07.2026.

АННОТАЦИИ ДЕПОНИРОВАННЫХ В БГУ РАБОТ
АНАТАЦЫІ ДЭПАНІРАВАНЫХ У БДУ ПРАЦ
INDICATIVE ABSTRACTS OF THE PAPERS DEPOSITED IN BSU

УДК 94(470)«1801/1905»(075.8) + 94(477)«1801/1905»(075.8)
Сергеенкова В. В. **История России и Украины (XIX в. – 1905 г.)** : электрон. учеб.-метод. комплекс для спец. 6-05-0222-01 «История», профилизация «Отечественная и всеобщая история» : в 2 ч. Ч. 1 / В. В. Сергеенкова, О. И. Ершова ; БГУ. Минск, 2025. 474 с. : ил. Библиогр.: с. 441–444. Режим доступа: https://elib.bsu.by/handle/123456789/347344. Загл. с экрана. Деп. в БГУ 18.05.2026, № 014815052026. Текст : электронный.

Электронный учебно-методический комплекс (ЭУМК) предназначен для студентов специальности 6-05-0222-01 «История». Содержание ЭУМК предполагает изучение следующих вопросов: различных этапов истории России и Украины XIX в. – 1905 г. и выработки целостной системы знаний. Курс связан единой концепцией, принципами отбора и преподавания материала. В основу курса положено объективное изучение исторического процесса России и Украины.

СОДЕРЖАНИЕ

ИСТОРИЯ БЕЛАРУСИ

Горшков А. Д. Предварительные результаты исследований нового памятника палеолита Белые речки – 1 (Волковысский район, Гродненская область)..... 5
Даркович А. Л. «Борьба за станок»: экономическая дискриминация населения Западной Беларуси в 1930-х гг. 20

ВСЕМИРНАЯ ИСТОРИЯ

Аннаев Т. Ж., Аннаев Ж. Т., Арзиев К. Д., Нормуминов М. Б., Эшкурбонов Ф. Н. Историко-культурные связи Согда и Бактрии (Кушаншахра, Тохаристана) в Античности и раннем Средневековье..... 30
Ефимов А. А. Особенности финансирования строительства дворца в Ореанде – первой крымской резиденции российской императорской семьи 40
Габриелян М. Р., Цатурян Р. А. Политика Армении в сфере охраны нематериального культурного наследия: от культурных практик до списков признания..... 47
Меньковский В. И. Терминологический аппарат исследований советской истории после Сталина..... 57

ТЕМАТИЧЕСКИЙ РАЗДЕЛ

Великая Отечественная война в исторической памяти Беларуси

Кулинок С. В. Деятельность Белорусского штаба партизанского движения по фиксации фактов нацистского геноцида на оккупированной территории Беларуси в 1942–1944 гг. 63
Корсак А. И. Нацистские детские лагеря на оккупированной территории Беларуси (1941–1944): к вопросу типологии..... 71
Зданович В. В. История женщин Беларуси в годы Великой Отечественной войны в работах отечественных исследователей..... 80

Аннотации депонированных в БГУ работ..... 86

ЗМЕСТ

ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ

Гаршкоў А. Д. Папярэднія вынікі даследаванняў новага помніка палеаліту Белыя рэчкі – 1 (Ваўкавыскі раён, Гродзенская вобласць)..... 5
Дарковіч А. Л. «Барацьба за станок»: эканамічная дыскрымінацыя насельніцтва Заходняй Беларусі ў 1930-я гг. 20

УСЕАГУЛЬНАЯ ГІСТОРЫЯ

Анаеў Т. Ж., Анаеў Ж. Т., Арзіеў К. Д., Нормумінаў М. Б., Эшкурбонаў Ф. Н. Гісторыка-культурныя сувязі Согда і Бактрыі (Кушаншахра, Тахарыстана) у Антычнасці і раннім Сярэдневякоўі..... 30
Яфімаў А. А. Асаблівасці фінансавання будаўніцтва дварца ў Арэандзе – першай крымскай рэзідэнцыі расійскай імператарскай сям'і..... 40
Габрыэлян М. Р., Цатуран Р. А. Палітыка Арменіі ў сферы аховы нематэрыяльнай культурнай спадчыны: ад культурных практык да спісаў прызнання..... 47
Менькоўскі В. І. Тэрміналагічны апарат даследаванняў савецкай гісторыі пасля Сталіна..... 57

ТЭМАТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

Вялікая Айчынная вайна ў гістарычнай памяці Беларусі

Кулінок С. В. Дзейнасць Беларускага штаба партызанскага руху па фіксацыі фактаў нацысцкага генацыду на акупаванай тэрыторыі Беларусі ў 1942–1944 гг. 63
Корсак А. І. Нацысцкія дзіцячыя лагеры на акупаванай тэрыторыі Беларусі (1941–1944): да пытання тыпалогіі..... 71
Здановіч У. В. Гісторыя жанчын Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны ў працах айчынных даследчыкаў..... 80

Анатацыі дэпаніраваных у БДУ прац..... 86

CONTENTS

BELARUSIAN HISTORY

Harshkou A. D. Previous research results for new Palaeolithic site Belyja rechki – 1 (Volkovysk District, Grodno Region)..... 5
Darkovich A. L. «Fight for the bench»: economic discrimination against the population of Western Belarus in the 1930s..... 20

WORLD HISTORY

Annaev T. J., Annaev J. T., Arziev K. D., Normuminov M. B., Eshkurbonov F. N. Historical and cultural relations of Sogd and Bactria (Kushanshahr, Tokharistan) in Antiquity and the Early Middle Ages..... 30
Yefimov A. A. Financing the construction of the palace in Oreanda – the first Crimean residence of the Russian imperial family..... 40
Gabrielyan M. R., Tsaturyan R. A. The Armenia's policy of intangible cultural heritage protection: from cultural practices to lists of recognition..... 47
Menkouski V. I. The terminological framework for research on Soviet history after Stalin..... 57

SPECIAL TOPIC SECTION

The Great Patriotic War in the historical memory of Belarus

Kulinok S. V. The activities of the Belarusian Headquarters of the Partisan Movement to record the facts of the nazi genocide in the occupied territory of Belarus in 1942–1944..... 63
Korsak A. I. Nazi children's camps in the occupied territory of Belarus (1941–1944): on the question of typology..... 71
Zdanovich V. V. History of women of Belarus during the Great Patriotic War in the works of domestic researchers..... 80

Indicative abstracts of the papers deposited in BSU..... 86

Журнал включен Высшей аттестационной комиссией Республики Беларусь в Перечень научных изданий для опубликования результатов диссертационных исследований по историческим наукам, а также в области музееведения, консервации, реставрации историко-культурных объектов, документалистики, документоведения и архивоведения.

Журнал включен в наукометрические базы данных научных публикаций Scopus и РИНЦ.

Журнал Белорусского государственного университета. История. № 3. 2026

Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гісторыя. № 3. 2026

Учредитель:
Белорусский государственный университет

Юридический адрес: пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Республика Беларусь.
Почтовый адрес: пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Республика Беларусь.
Тел. (017) 259-72-34, (017) 259-72-38.
E-mail: jhistory@bsu.by
URL: https://journals.bsu.by/index.php/history

«Журнал Белорусского государственного университета. История» издается с января 1969 г. До 2017 г. выходил под названием «Веснік БДУ. Серыя 3, Гісторыя. Эканоміка. Права» (ISSN 2308-9172).

Редакторы *А. С. Люкевич, С. Р. Пинчук*
Технические редакторы *А. Р. Голик, М. А. Панкратова*
Корректор *Л. А. Меркуль*

Подписано в печать 31.07.2026.
Тираж 25 экз.

© БГУ, 2026

Journal of the Belarusian State University. History. No. 3. 2026

Founder:
Belarusian State University

Registered address: 4 Niezaliezhnasci Ave., Minsk 220030, Republic of Belarus.
Correspondence address: 4 Niezaliezhnasci Ave., Minsk 220030, Republic of Belarus.
Tel. (017) 259-72-34, (017) 259-72-38.
E-mail: jhistory@bsu.by
URL: https://journals.bsu.by/index.php/history

«Journal of the Belarusian State University. History» published since January, 1969. Until 2017 named «Vesnik BDU. Seryja 3, Gistoryja. Jekanomika. Prava» (ISSN 2308-9172).

Editors *A. S. Lyukevich, S. R. Pinchuk*
Technical editors *A. R. Golik, M. A. Pankratova*
Proofreader *L. A. Merkul'*

Signed print 31.07.2026.
Edition 25 copies.

© BSU, 2026